Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ЖНІЎНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 147 (26260)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Увага! «Прамая лінія»**

## Пенсійная тэма. Якія праблемы?

Асаблівасці вызначэння стажу, разлік індывідуальнага каэфіцыента, датэрміновы выхад на пенсію, змяненні ў заканадаўстве — аб гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» з удзелам **начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» пройдзе **19 жніўня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары 287 17 57.

# «Звычайная работа»



*Мікалай ЛІТВІНОВІЧ.*

У брыгадзе Мікалая Кавальчука з ААТ «Відамлянскае» першым нас сустрэў пажарны разлік. Ігар Кіскевіч і Аляксандр Аніскевіч далёка не першую кампанію нясуць вахту на палях. Расказалі, як за гады службы даводзілася тушыць тэхніку і спраўляцца з рознымі надзвычайнымі здарэннямі. Паводле слоў агранома гаспадаркі, лепей перасцерагчыся, бо страціць камбайн падчас уборкі — сапраўдная бяда...

Віктар Іванюк і яго памочнік Аляксей Валчок намалацілі на сваёй «Лідзе» з пачатку ўборкі крыху больш чым 600 тон збожжа. Апошнія некалькі дзён косяць лубін. Працоўная змена заканчваецца ў трычатыры гадзіны раніцы. «Звычайная работа» — так ахарактарызаваў уборачную кампанію камбайнер Віктар Іванюк. Сціпласці ў старэйшага таварыша вучыцца і памочнік, студэнт Высокаўскага аграрнага каледжа Аляксей Валчок, бо таксама ні слова не сказаў пра цяжкасці ў працы. Брэсцкі хлопец ужо не першы сезон прыязджае на лета да дзядзькі (Аляксей даводзіцца Віктару пляменнікам) і садзіцца на камбайн на час уборкі.

Для механізатараў, вядома, уборачная — з'ява прывычная, асабліва для тых, хто не першы год за штурвалам камбайна. Якая гэта насамрэч цяжкая і напружаная праца, заўважыў галоўны аграном гаспадаркі Аляксандр Русецкі: «Нават без работы, калі не спаць да чатырох раніцы, можна стаміцца. А пасля такой змены і ногі дрыжаць, і галава з цяжкасцю працуе. Самому даводзілася некалькі разоў на пачатку ўборкі затрымлівацца на палях да раніцы, а праз пару гадзін выходзіць на новую змену. Таму, калі нехта ўжывае выраз «героі жніва» з адценнем іроніі, разумею, што гэта ад несвядомасці. Недасведчанаму цяжка расказаць пра сутнасць работы хлебароба. Якая ні была б сучасная тэхніка, час уборкі патрабуе шмат чалавечых намаганняў».

У суседняй гаспадарцы «Агра-Турна» таксама давялося сустрэць экіпаж з памочнікам камбайнера — студэнтам. Бацька і сын Мікалай Паўлавіч і Сяргей Літвіновічы — лідары па намалоце на сваім сельгаспрадпрыемстве. 800 тон збожжа сабралі на камбайне «CASE». Мікалай Літвіновіч сёмую ўборку працуе на гэтай машыне, раней хлеб убіраў на «Ніве». Параўнанне старой тэхнікі з новай вопытны механізатар зрабіў вобразнае: «як «Масквіч» і «Мерсэдэс». У гаспадарцы тры нямецкія збожжаўборачныя машыны, і працаўнікі іх ацэньваюць высока. А вось дырэктар «Агра-Турна» Сяргей Шальпук сказаў, што апошнім часам ён аддае перавагу айчыннай тэхніцы. Летась паляцеў вал на замежным камбайне, замена дэталі абышлася ў 12 мільёнаў рублёў. І чакаць давялося, пакуль той вал прыслалі з Германіі.

Сёлетнім ураджаем новы кіраўнік гаспадаркі (Сяргей Яўгенавіч працуе ўсяго год) задаволены. Летась замянілі працэнтаў 90 насення, што таксама паспрыяла добрым вынікам. Словам, ураджай чакаецца рэкордны за апошняе дзесяцігоддзе.

— Як і ў цэлым па раёне, — заўважыў намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама Іван Сямейка. — На 6 жніўня ў гаспадарках было скошана і абмалочана амаль 62 працэнты збожжавых і зернебабовых. Летась на гэты дзень уборка была амаль завершана. Цяпер пачалі пазней, але ўраджай чакаецца сапраўды рэкордным. Кожны гектар дае амаль 43 цэнтнеры збожжавых. Летась было каля 29. На неба заглядваем, бо кожны дзень праходзіць дождж, але прыкладна пяць працэнтаў у дзень збіраем. За дзён дзесяць мяркуем сабраць усю збажыну з палёў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*




# БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ МОЦНАЙ АПОРАЙ ДЛЯ КІТАЯ Ў ЕЎРОПЕ

Аб гэтым 7 жніўня ў Пекіне заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй КНР Ху Цзіньтао.

«Большых сяброў, чым Беларусь, у Еўропе ў вас няма. Мы і ў далейшым будзем праводзіць палітыку так, як праводзілі апошнія 10—15 гадоў. Мы будзем моцнай апорай — я аб гэтым сёння публічна заяўляю», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы гатовы для кітайскага народа зрабіць усё, каб вы маглі дастойна прадставіць свае інтарэсы на еўрапейскім кантыненце. Таксама публічна хачу прапанаваць вам больш сур'ёзна заняцца гэтым напрамкам супрацоўніцтва аж да стварэння сумеснай групы для прапрацоўкі адпаведных пытанняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі з радасцю ўспрынялі вестку аб тым, што КНР выйграла права прыняць XXIX Алімпійскія гульні. Ён таксама дадаў, што Кітай зрабіў вельмі шмат для таго, каб правесці Алімпіяду на дастойным узроўні.

Ху Цзіньтао падзякаваў Беларусі за падтрымку Кітая ў ходзе падрыхтоўкі да Алімпіяды. У прыватнасці, старшыня КНР асабліва адзначыў той факт, што Прэзідэнт Беларусі ў красавіку гэтага года выступіў з сур'ёзнай заявай у падтрымку кітайскага боку, калі ў міжнароднай супольнасці некаторыя палітычныя сілы спрабавалі блакіраваць пекінскую Алімпіяду.

Ху Цзіньтао выказаў гатоўнасць абмеркаваць на перагаворах пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння, а таксама абмяняцца думкамі па шырокім коле праблем.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 7 жніўня наведаў Алімпійскую вёску, дзе сустрэўся з беларускай алімпійскай камандай і ўручыў спартсменкам дзяржаўныя ўзнагароды.

Двухразовая пераможца, сярэбраны і бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў, пяціразовая чэмпіёнка свету па акадэмічным веславанні Кацярына Карстэн удастоена ордэна Айчыны І ступені. Ёй таксама прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта «Беларускі спартыўны Алімп» 2008 года.



Бронзавым прызёрам Алімпіяды ў Афінах і неаднаразовым чэмпіёнкам свету Юліі Бічык і Наталлі Гелах Аляксандр Лукашэнка ўручыў ордэн Айчыны ІІІ ступені.

Прэзідэнт азнаёміўся з умовамі пражывання членаў беларускай алімпійскай каманды. «Мы чакаем ад вас дастойнага выступлення», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да беларускіх спартсменаў.

Беларускі сцяг узняты 7 жніўня ў Алімпійскай вёсцы ў Пекіне. На гэтай знамянальнай падзеі ад Беларусі прысутнічалі больш як 100 чалавек: спартсмены, трэнеры, суправаджальныя асобы.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў кітайскай карпарацыі «Сіцік» больш актыўна супрацоўнічаць з Беларуссю. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы на сустрэчы са старшынёй праўлення карпарацыі Кун Данам, беларускі бок запрашае «Сіцік» «больш актыўна ісці ў Беларусь».

«Вы ведаеце нашы магчымасці і патрэбнасці. У гэтым выпадку нас вельмі цікавіць сфера будаўніцтва. Калі вашых спецыялістаў гэта таксама цікавіць, мы з вялікім задавальненнем падрабязна раскажам аб праектах і задумах у будаўнічай галіне Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, Кітаю сёння даводзіцца ў пэўнай ступені стрымліваць тэмпы росту, каб не «перагрэць» эканоміку. «Таму, хочаце вы або не, вы будзеце працаваць і будаваць за мяжой. Мы хацелі б, каб «Сіцік» больш актыўна працавала ў Беларусі. Толькі я папрасіў бы: калі вы прымеце рашэнне працаваць у Беларусі, то дзейнічаць трэба вельмі хутка, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Давайце ў бліжэйшы час абмяркуем напрамкі супрацоўніцтва, і калі будзе магчымасць, прыязджайце ў Беларусь. Мы разгледзім на ўрадзе многія праекты, паколькі ў нас вельмі разнапланавая кампанія з рознымі напрамкамі дзейнасці: ад урада да фінансаў. Думаю, вы знойдзеце ў Беларусі сваё месца».

Звяртаючыся да Кун Дана, Прэзідэнт адзначыў таксама зацікаўленасць у тым, каб «Сіцік» аказала садзейнічанне беларускаму боку ў стварэнні падобнай кампаніі, няхай нават у меншых маштабах у нашай рэспубліцы.

«На гэты ўзор, на гэтым прыкладзе мы маглі б стварыць нават некалькі кампаній у Беларусі. Для нас вельмі важны вопыт Кітайскай Народнай Рэспублікі менавіта ў стварэнні такіх дзяржаўных кампаній, хоць я не выключаю, што там можа прысутнічаць і прыватны капітал. З вашай дапамогай мы зможам рэалізаваць гэты праект у два разы хутчэй. Я бачу тут вельмі шмат пераваг, у тым ліку і ў тым, што такая карпарацыя — кузня для падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў высокай кваліфікацыі», — дадаў Прэзідэнт.

Першыя кантакты беларускага боку з карпарацыяй «Сіцік» па пытаннях рэалізацыі інвестыцыйных праектаў былі ўстаноўлены ў 2007 годзе. Практычнае развіццё атрымаў праект будаўніцтва трох цэментных заводаў і мадэрнізацыі энергазабеспячэння трох дзеючых у Беларусі цэментных заводаў.

Цяпер агульныя актывы групы «Сіцік» складаюць звыш $200 млрд.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.



## Нацбанк Беларусі з 13 жніўня павышае стаўку рэфінансавання да 10,5 працэнта гадавых

**Нацыянальны банк Беларусі з 13 жніўня павышае стаўку рэфінансавання на 0,25 працэнтнага пункта да 10,5 працэнта гадавых.**

У Нацбанку растлумачылі, што такое рашэнне прынята ў мэтах павышэння даходнасці зберажэнняў у нацыянальнай валюце і далейшага стымулявання росту ўкладаў насельніцтва і прадпрыемстваў у банках, а таксама збалансаванасці фінансавага рынку з улікам развіцця знешніх і ўнутраных эканамічных працэсаў.

**БЕЛТА.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У СОЧЫ НА ПЛЯЖЫ ПРАГРЫМЕЎ ВЫБУХ

**На адным з пляжаў у пасёлку Лоа (Вялікі Сочы) у чацвер адбыўся выбух, у выніку якога загінулі два чалавекі і мінімум 13 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці. Сярод іх 8-гадовая дзяўчынка.**

Выбух быў такой сілы, што яго было чуваць прыкладна ў радыусе кіламетра ад пляжа. Здарэнне адбылося ў раёне 10.00—10.30 за 3—5 метраў ад урэзу вады. Як паведамляюць відавочцы, два чалавекі — мужчына і жанчына — падыходзілі да пляжа і ўбачылі на дарозе пакет. Жанчына нахілілася, каб яго падняць, — прагрымеў выбух. 31-гадовы мужчына з Растова- на-Доне і 22-гадовая дзяўчына з Кіева загінулі на месцы. Сярод пацярпелых у асноўным жыхары Растоўскай вобласці і Ніжняга Тагіла. У іх асколачныя раненні, разнастайныя траўмы і драпіны. Адзін чалавек атрымаў цяжкае раненне — яму адарвала нагу. Пацярпелых магло быць больш — магчыма, яны звернуцца па дапамогу пазней.

УУС Сочы прызначыла ўзнагароду ў памеры 2 мільёнаў рублёў за інфармацыю, якая датычыцца выбуху. Спецыялісты, якія працавалі на месцы здарэння, іншых выбуховых прыстасаванняў не выявілі.

### ГРУЗІЯ ПЕРАКІДВАЕ ВАЕННУЮ ТЭХНІКУ ДА МЯЖЫ

**Наваколле Цхінвалі ўчора ў другой палове дня падверглася артылерыйскаму абстрэлу. У баявую гатоўнасць былі прыведзены расійскія міратворцы ў зоне канфлікту, а таксама войскі ў Абхазіі, якая абяцае дапамогу асецінам у выпадку агрэсіі.**

Раней Грузія перакінула вайскоўцаў у накірунку Паўднёвай Асеціі. Да Горы рухалася ваенная калона ў складзе 20 грузавікоў з салдатамі, 20 кузаўных джыпаў Toyota з салдатамі, узброенымі станковымі кулямётамі, трох БМП, трох установак залпавага агню і трох гармат. Савет бяспекі Паўднёвай Асеціі абвясціў, што падчас бою ў раёне сяла Нулі знішчаны грузінскі БТР і некалькі вайскоўцаў. Разам з тым, не пацвердзіліся ранішнія паведамленні аб чатырох мірных жыхарах, загінулых у выніку начных абстрэлаў сёлаў з грузінскага боку.



### ПІВА, ВЫРАБЛЕНАЕ ПА ЛІЦЭНЗІІ, НЕ БУДЗЕ ЛІЧЫЦЦА ЧЭШСКІМ

**Чэшскае піва, выраблене па ліцэнзіі ў іншых дзяржавах, не будзе лічыцца чэшскім. Гэта адбудзецца пасля таго, як ЕС прызнае чэшскае піва ахоўным нацыянальным брэндам.**

Пасля гэтага піва, выраблене не на тэрыторыі Чэхіі, не будзе мець права насіць на этыкетцы назву «чэшскае». Тэхналагічныя ўмовы вытворчасці піва, выробленага па чэшскіх ліцэнзіях за мяжой, у разлік прымацца не будуць.

Працяг еўрапейскай сенсацыі

# БАТЭ ВЫБІЎ «АНДЭРЛЕХТ» З ЛІГІ ЧЭМПІЁНАЎ!

**У паўторным матчы другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ ўнічыю (2:2) згуляў з бельгійскім «Андэрлехтам» і па суме дзвюх сустрэч стаў пераможцам (першую ў Брусэлі БАТЭ выйграў 2:1). Першы матч трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў барысаўчане правядуць 13 жніўня ў Сафіі супраць балгарскага «Леўскі», сустрэча ў адказ мае адбыцца 27 жніўня ў Барысаве.**



БАТЭ адкрыў лік ужо на 18-й хвіліне сустрэчы — вызначыўся Генадзь Блізнюк. Але праз пяць хвілін бельгійцы лік зраўнялі дзякуючы голу з пенальці Лукаса Білы. За сем хвілін да заканчэння матчу БАТЭ зноў выйшаў наперад пасля ўдару Віталя Радзівонава. На 86 хвіліне бельгійцы здолелі зраўняць лік, але большага «Андэрлехту» дасягнуць не ўдалося.

Многія еўрапейскія СМІ назвалі выхад БАТЭ ў трэці раўнд сенсацыяй. А галоўны трэнер беларускага чэмпіёна Віктар Ганчарэнка сказаў, што ў яго выдатная каманда, у выхадзе якой у трэці раўнд ён не сумняваўся. Настаўнік барысаўчан даў зразумець, што яго клуб у Лізе чэмпіёнаў ставіць перад сабой даволі сур'ёзныя задачы, і папрасіў не заніжаць магчымасці яго футбалістаў. Галоўны трэнер саперніка Арыэл Якабс расказаў, што, нягледзячы на паражэнне ў першым матчы, у Барысаве ён усё ж разлічваў на поспех. Аднак стаўка на больш высокі клас футбалістаў «Андэрлехта», у якім сабраны легіянеры з Аргенціны, Польшчы, Чэхіі і іншых краін, не спрацавала. Гульня ў Барысаве пацвердзіла, што беларускія футбалісты ім не саступаюць.

Пасля матчаў 6 жніўня канчаткова вызначыліся ўсе пары ўдзельнікаў трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў: «Спартак» (Масква, Расія) — «Дынама» (Кіеў, Украіна), «Шахцёр» (Данецк, Украіна) — «Дынама» (Заграб, Харватыя), «Стандарт» (Бельгія) — «Ліверпуль» (Англія), «Твентэ» (Галандыя) — «Арсенал» (Англія), «Барселона» (Іспанія) — «Вісла» (Польшча), «Шальке-04» (Германія) — «Атлетыка» (Іспанія), «Ювентус» (Італія) — «Артмедыа» (Славакія), «Фіярэнціна» (Італія) — «Славія» (Чэхія), «Бран» (Нарвегія) — «Марсэль» (Францыя), «Галатасарай» (Турцыя) — «Сцяўа» (Румынія), «Партызан» (Сербія) — «Фенербахчэ» (Турцыя), «Панацінаікас» (Грэцыя) — «Спарта» (Чэхія), «Анартосіс» (Кіпр) — «Алімпіякас» (Грэцыя), «Гімараеш» (Партугалія) — «Базэль» (Швейцарыя), «Ольбарг» (Данія) — «Каўнас» (Літва).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.08.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 265,61 |
| 1 латвійскі лат | 4 632,94 |
| 1 літоўскі літ | 945,77 |
| 1 чэшская крона | 136,35 |
| 1 польскі злоты | 1005,72 |
| 1 расійскі рубель | 89,52 |
| 1 украінская грыўня | 456,24 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 23,5816 |
| 10 UAH | 50,9322 |
| 1000 BYR | 11,1497 |
| EUR | 36,4737 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 7.08.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08147>

**ОАО «Минскконтракт» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)**

**ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже зданий, сооружений и иного имущества, расположенного на ул. Смоленская, 51 в г. Минске, единым лотом. В состав лота входит следующее имущество:

| № п/п | Наименование объектов | Инв. № |
|---|---|---|
| 1 | Административное здание (общая площадь – 162,5 кв.м) | 565 |
| 2 | Здание склада (общая площадь – 362,9 кв. м) | 567 |
| 3 | Здание склада (общая площадь – 858,3 кв. м) | 568 |
| 4 | Здание склада (общая площадь – 193,7 кв. м) | 569 |
| 5 | Здание склада (общая площадь – 731,5 кв. м) | 570 |
| 6 | Здание бытового назначения (общая площадь – 96,1 кв. м) | 571 |
| 7 | Открытая площадка (площадь – 0,9 га) | 572 |
| 8 | Навес (общая площадь – 182 кв. м) | 573 |
| 9 | Водопровод наружный (длина – 230 м) | 574 |
| 10 | Наружное освещение | 941 |
| 11 | Ограждение железобетонное внешнее с воротами | 942 |
| 12 | Канализация бытовая (длина — 14 м) | 943 |
| 13 | Насаждения | 944 |
| 14 | Водосчетчик Віp-М | 212 |
| 15 | Прибор учета тепла ФС-31М1 | 1 |

Площадь земельного участка – 1,2031 га, кадастровый номер 500000000001001893. Отвод земельного участка будет производиться Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

Начальная цена лота – 4 851 713 294 белорусских рубля без учета НДС.

Продаваемое имущество обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 485 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 25 августа 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 августа 2008 года до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

УНП 190398583.

БЕЛАРУСБАНК

***ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает, что с 11 августа 2008 года прекращается прием денежных средств на банковские вклады:***

**В белорусских рублях:**

- срочный банковский вклад в белорусских рублях «Гарантированный доход» (срок – 35 дней);
- срочный вклад в белорусских рублях «Юбилейный» (срок – 45 дней);
- срочный банковский вклад «XXI век» в белорусских рублях (срок – 100 дней, 190 дней);
- срочный банковский вклад «К отпуску» (срок – 1 год);
- специальный накопительный счет срочного выкупа для получения ежемесячного дохода (срок – 360 дней);
- специальный накопительный счет в белорусских рублях (срок – до востребования).

**В иностранной валюте:**

- срочный банковский вклад в иностранной валюте (срок – 3 месяца);
- срочный банковский вклад в иностранной валюте с правом пополнения (срок – 6 месяцев, 12 месяцев).

***Предлагаем разместить денежные средства на следующие виды вкладов:***

**В белорусских рублях:**

- **«Накопительный»** – на 3 года, с правом пополнения и ежемесячной капитализацией – 15 процентов годовых;
- **«Мобильный»** – на 2 года, с правом пополнения и ежемесячной капитализацией, возможностью совершать расходные операции в размере 30 процентов от суммы остатка вклада на дату совершения операции – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 2 процентных пункта;
- **«Юбиляр»** – на 30 месяцев, с правом пополнения и ежемесячной капитализацией, возможностью совершать расходные операции по истечении 1 месяца со дня заключения договора – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 2 процентных пункта, дополнительный доход – 1 процент годовых в случае отсутствия расходных операций.

**В иностранной валюте:**

- **«Срочный вклад на 380 дней»**, в долларах США, евро, 7 процентов годовых, ежемесячная капитализация;
- **«Срочный вклад на 40 месяцев»**, в долларах США, евро, 9,5 процента годовых, капитализация в конце года, с правом пополнения в течение 30 месяцев;
- **«Капитал»** – на 18 месяцев (в долларах США, евро), 8 процентов годовых, в течение 6 месяцев со дня заключения договора размер процентной ставки не изменяется, ежеквартальная капитализация;
- **«Универсальный»** – на 2 года (в долларах США, евро, юанях КНР), 8,5 процента годовых, ежемесячная капитализация, дополнительный доход – 0,5 процента годовых в случае отсутствия расходных операций;
- **«Российский»** – на 18 месяцев (в российских рублях), 8 процентов годовых, ежемесячная капитализация.

* * *

*Дополнительную информацию по размещению денежных средств на банковские вклады можно получить в любом учреждении банка или на сайте банка*

**http://www.belarusbank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912*

# Прэм'ер-міністр Беларусі ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды

Узнагароды ўручаны 17 грамадзянам. Звяртаючыся да іх, Сяргей Сідорскі адзначыў: «Менавіта вы ўвасабляеце працавітасць і стабільную Беларусь. Сваім асабістым прыкладам вы пацвярджаеце, што добрасумленная праца — залог багацця нашага народа, крыніца шчасця і дабрабыту кожнага чалавека. Дзякуючы стваральнай працы такіх людзей, як вы, наша краіна прадаўжае паспяхова развівацца ва ўсіх галінах».

Сярод узнагароджаных — работнікі будаўнічага комплексу, культуры, навукі, адукацыі. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены генеральны дырэктар ДВА «Мінскбуд» Віктар Сыс. За высокае прафесійнае майстэрства, дасягненне творчых паказчыкаў медалём «За працоўныя заслугі» таксама ўзнагароджаны галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь установы «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Філармонія» Аляксандр Анісімаў.

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны рэжысёр-пастаноўшчык канцэртных праграм ТАА «Голд-мьюзік.Ру» (г.Масква) Сяргей Пятроў.

Асобныя словы падзякі Сяргей Сідорскі адрасаваў майстрам будаўнічага комплексу краіны. «Менавіта вамі шмат зроблена для таго, каб уводзімыя ў рэспубліцы будынкі, збудаванні вызначаліся архітэктурнай навізной і зручнасцю для тых, хто будзе ў іх жыць, адпачываць і працаваць», — сказаў ён.

У прыватнасці, за шматгадовую плённую працу ў будаўнічай галіне Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена майстрам ААТ «Будтрэст № 25».

**БЕЛТА.**

# Курсантам ваенных ВНУ Беларусі будзе прадастаўляцца матэрыяльная дапамога на праезд

Палажэнне аб парадку прадастаўлення матэрыяльнай дапамогі на праезд курсантам дзённай формы навучання ваенных навучальных устаноў, устаноў адукацыі Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях зацвердзіў Савет Міністраў Беларусі.

У адпаведнасці з дакументам курсантам, сярэднедушавы даход сям'і якіх па аб'ектыўных прычынах не перасягае 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага ўрадам Беларусі, за два апошнія кварталы, прадастаўляецца матэрыяльная дапамога на праезд.

Курсантам навучальных устаноў прадастаўляецца кампенсацыя 50 працэнтаў кошту праезду (праязнога дакумента) да месца пражывання сям'і (бацькоў): не больш як за дзве паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў; не больш як за чатыры паездкі (туды і назад) у месяц на пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў. Па жаданні курсанта яна можа быць заменена матэрыяльнай дапамогай на праезд па месячным праязным білеце на адзін з відаў гарадскога пасажырскага транспарту ад месца пражывання курсанта да навучальнай установы.

Матэрыяльная дапамога на праезд курсантам навучальных устаноў прадастаўляецца ў суботу і нядзелю, святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя нерабочымі, а таксама ва ўсе дні тыдня пры адбыцці ў водпуск, але не раней чым з дня падачы рапарта з усімі неабходнымі дакументамі.

Рашэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі канкрэтнаму курсанту і яе памеры прымаецца пастаянна дзеючай камісіяй па прадастаўленні матэрыяльнай дапамогі на праезд, што ствараецца ў навучальнай установе, на працягу 5 рабочых дзён з дня падачы рапарта з усімі неабходнымі дакументамі. Камісію ўзначальвае начальнік навучальнай установы (ваеннага факультэта цывільнай установы адукацыі).

Сярэднедушавы даход сям'і курсанта вылічваецца за тры месяцы, якія папярэднічаюць месяцу звароту па прадастаўленне матэрыяльнай дапамогі на праезд. Сярэднедушавы даход сям'і вызначаецца шляхам дзялення сукупнага даходу ўсіх членаў сям'і за разліковы перыяд на колькасць месяцаў у гэтым перыядзе і на колькасць членаў сям'і, улічаных у яе складзе.

Выплата матэрыяльнай дапамогі на праезд ажыццяўляецца ў парадку і тэрміны, устаноўленыя ў навучальнай установе для выплаты грашовага забеспячэння.

**БЕЛТА.**

## Банкі

# ПАСПЯХОВЫ СТАРТ

Беларускі Індустрыяльны банк датэрмінова размясціў першы выпуск карпарацыйных аблігацый з аб'ёмам эмісіі 7,0 млрд беларускіх рублёў. Паводле слоў начальніка ўпраўлення каштоўных папер цэнтральнага офіса ААТ «Беларускі Індустрыяльны банк» Юрыя Плявакі, аблігацыі карысталіся павышаным попытам у суб'ектаў гаспадарання, і звязана гэта, перш за ўсё, са змяненнямі ў нарматыўнай базе па падаткаабкладанні даходаў ад рэалізацыі каштоўных папер. У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 5 ад 20.03.2008 г. («Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.12.1999 г. № 43»), даходы, атрыманыя ад рэалізацыі і пагашэння аблігацый юрыдычных асобаў, не абкладаюцца падаткам на даходы.

Зараз у Беларускім Індустрыяльным банку пачалася работа па размяшчэнні другога выпуску карпарацыйных аблігацый, аб'ём эмісіі якога складае 20,0 млрд беларускіх рублёў. Перыяд размяшчэння аблігацый — з 5 жніўня па 29 кастрычніка 2008 года, а перыяд абарачэння — з 5 жніўня 2008 года па 11 лістапада 2009 года (463 дні). Даходнасць 12,0 % гадавых пры размяшчэнні «да пагашэння» на першасным рынку. Як лічаць аналітыкі фондавага рынку, на сёння гэта вельмі прывабная і канкурэнтаздольная працэнтная стаўка ў параўнанні з дзяржаўнымі каштоўнымі паперамі.

**Алена АНІНА.**

Валянцінкай

# КАБ ХЛЕБ, ДА ХЛЕБА... І НЕ ТОЛЬКІ

**...«Я жыву адзін, але не адзінокі», — кажа пра сваё жыццё-быццё дзядуля Сцяпан. Кажа, ну згадзіцеся, вельмі коратка, кажа — чыстую праўду, з добрай доляю форсу...**

І падстаў для гэтага больш чым дастаткова. Першая — гэта ўзрост: дзеду 80 і нават з хвастом (іншыя ў гэтым узросце... Зрэшты, што вам казаць?..). Другая — за спінай у дзеда вайна з кантузіямі і двума раненнямі, пасля якіх іншыя дажывалі калекамі, а ён — не, выкараскаўся, 42 гады працаваў, і нават (чым не падстава для гонару) не паперкі на стале перакладаючы...

Трэцяя — сына ён вырасціў, дачу збудаваў, дзве аперацыі перанёс, жонку пахаваў... І нават пасля гэтага — нікога не абцяжарвае, нікому не замінае, жыве, можна сказаць, самастойна, адзін...

Але ж, дзякуй богу, і насамрэч, не адзінокі, бо да яго часцяком прыходзяць суседзі і суседкі — калі з клопатамі, калі проста так, пагаманіць; бо да яго хоць раз на тыдзень зазірае сын — прыносіць стос адносна свежых газет, літровую «пластмаску» піва, а часцяком — і жоўтую бліскучую скумбрыю. Разам яны сядзяць на канапе альбо за столікам у лоджыі (там можна смаліць) — частуюцца (хоць дзед, шчыра кажучы, не любіць ні той рыбы, ні піва), спрабуюць размаўляць. Праўда, тэм у іх неяк няшмат, і размовы зусім не клеяцца...

Таму госць абачліва ўключае тэлевізар — яны проста сядзяць пры ім, робяць выгляд, што глядзяць. Сын — на экран. Бацька — цішком — на сына. Бо той акурат, як некалі ён, — прыгожы, дужы, малады. Шкада, што адзін. На другое дзіця не згаджалася колісь нябожчыца-жонка. Казала: «Што мы ім дамо, як мы абаіх вывучым?» А атрымалася, што не вучылі і аднаго. Пасля школы хлопец як адрэзаў: «Вучыцца не пайду... Працаваць буду». Вось і працуе — усё жыццё ля станка.

Але «хлопца» гэта не псуе.

Дзед любіць сына.

Любіць ён і свайго малодшага ўнука. Яму 25, халасцяк яшчэ. Але, мусіць, апошнія месяцы, бо дзяўчына ўжо ёсць. Даўно сустракаюцца, ідзе да вяселля як быццам. Але, што дзеда здзіўляе, «не жывуць пакуль» — у сэнсе начаваць хлопец ездзіць дамоў. Калі рана расстануцца... Калі пазней — жаніх звоніць дзеду (да яго бліжэй), просіцца нанач. А тому што — пакой вольны ёсць, ложак таксама (і нават не адзін), спі сабе. Яму нават прыемна ноч-апоўнач надчэкваць таго начлежніка, чуць, як ён сваім ключом адчыняе кватэру, як ляпаюць потым дзверы халадзільніка. А да таго — уяўляць, як яны з той дзеўкаю недзе сядзяць ці гуляюць.

Ад думак гэтых дзед і сам як быццам маладзее, успамінае сваё...

Не так часта, як хацелася б, зазірае да дзеда і ўнучка. Лапоча з парога: «Ой, дзеданька, я цябе так шкадую, гэтак люблю! Ты ж ведаеш, я кожны вечар да цябе прыбегла б... Але ж вучоба, клопаты!».

Дзед, ну вядома ж, разумее — усё, запрашае госцю на кухню, частуе, «чым Бог паслаў», потым (гэта як рытуал у іх... Пад добры настрой) выцягвае з кашалька адну-другую купюрыну, як у маленстве калісь, аддае «малой» «на цукеркі», «на марожанае».

Прыходзіць да дзеда і яшчэ адна госця — нявестка. Тая, у адрозненне ад іншых, з парога, лічы, пачынае сварыцца і, што цікава, прычыну для гэтага знойдзе заўсёды. То ён малатком на паліраваным століку цвік параўняў, то «цэлую хату» пяску нанасіў, то нешта не з'еў з таго, што стаяла ў халадзільніку, і цяпер гэта трэба выкідваць, то нарэзаў дзірачак у новым ручніку, то працініоню выцер зубныя пратэзы, то зноў «падпаліў» каструлю, то запэцкаў...

Зносіць гэтую звягу дзеду, зразумела ж, цяжка, і ён не маўчыць: кажа ёй, што цвік той толькі трошачкі быў пагнуты і яму патрэбны, што пераабуцца спачатку не паспеў, бо спяшаўся да тэлефона, а потым — зусім забыўся; што ежу лепш класці ў большы посуд, а малы, нябачны ў халадзільніку, пакідаць для малых.

Пытае ў яе і пра тое, якая розніца, чым выціраць «казённыя» зубы — абы чыстым...

І на чым вісець ручніку (на вешалцы ці на дзірках, зробленых па краях) — таксама ж не пытанне, а чыстае бабскае занудства. Як і пра каструлю: «Ды халера з ёй! — Злаваў. — Заўтра ж сам пайду ў краму і куплю дзве новыя!».

Хоць у глыбіні душы ён, безумоўна ж, разумеў, што праблема зусім не ў пасудзіне (хоць цана на яе потым і ўразіла)...

А яшчэ дзед бачыў, што сварылася нявестка, як бы між іншым, прыхваткамі, уключыўшы ў хаце, здаецца, адразу і ўсё — пральную машыну, газ, пыласос... Там у яе нешта мылася, там варылася, там чысцілася-прасавалася... Кватэра паступова запаўнялася пахамі — некалі, ну зразумела ж, зусім звычайнымі, цяпер — не: пахамі гарачай капусты і катлет, тушанай гародніны, свежапамытай падлогі і бялізны, пахамі мінулага, шчаслівага жыцця.

Услед за гэтым на стале з'яўляліся талеркі, лыжкі-відэльцы, хлеб. Разам яны садзіліся есці і гаманіць.

Дзед вельмі любіў гэтую гадзінку, бо за час свайго ўдаўства так і не прывык сталавацца адзін — чакаў, каб яму нешта падалі, каб папыталіся, ці смачна, ці хапае солі, прыпраў?

А яшчэ ён ведаў, што, крыху пасядзеўшы і падсілкаваўшыся, а потым у чарговы раз памыўшы посуд і паказаўшы яму, дзе што стаіць, што трэба есці і як трэба жыць, нявестка... нарэшце пойдзе, ён застанецца сам-насам і будзе рабіць што захоча: наводзіць свае парадкі ў хаце, глядзець тэлевізар альбо з балкона ў двор, чытаць, ляжаць, званіць камусь па тэлефоне... І ніхто яму не ўказ, ніхто ні ў чым не запярэчыць, ніхто нічога не забароніць, нават не скажа.

Пакуль назаўтра ці праз дзень не прыйдзе адведаць сын.

Альбо — нанач — унук.

Ці па грошы ўнучка.

Што ні кажы, ён любіць, калі да яго прыходзяць. Любіць усіх. Але... *пасля таго,* як прыйдзе і пойдзе нявестка.

**Валянціна ДОЎНАР.**

Сяргей СІДОРСКІ:

# «Мадэль падатковай сістэмы Беларусі па методыцы разліку і выплаты падаткаў павінна адпавядаць еўрапейскай»

**Аб гэтым прэм'ер заявіў на выязной нарадзе па пытаннях спрашчэння падатковай сістэмы ў рэспубліцы.**

Паводле яго слоў, цяпер беларуская мадэль «не самая горшая, але ў ёй ёсць вузкія месцы».

Сяргей Сідорскі лічыць: «Падатковая сістэма, якую мы павінны выбудаваць у краіне, павінна стаць незваротнай і адпавядаць стандартам эканомікі еўрапейскіх дзяржаў. Але пры гэтым яна павінна апірацца на рэаліі эканамічнага развіцця Беларусі».

Апошнім часам у Беларусі праведзена значная работа па ўдасканаленні гэтай сістэмы, у выніку чаго зніжаецца падатковая нагрузка, спрашчаецца механізм спагнання падаткаў, скарачаецца іх колькасць. У прыватнасці, на працягу 2005—2007 гадоў адменена 17 падатковых плацяжоў. Значна спрошчана падаткаабкладанне малых і сярэдніх прадпрыемстваў.

«Але аб завяршэнні работы па ўдасканаленні падатковай сістэмы Беларусі гаварыць пакуль рана», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

У 2009—2010 гадах плануецца прадоўжыць работу па спрашчэнні падатковай сістэмы і зніжэнні падатковага цяжару на эканоміку.

Так, у 2009 годзе прадугледжваецца зніжэнне стаўкі збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, прадуктаў харчавання і аграрнай навукі да 1 працэнта ад выручкі, атрыманай ад рэалізацыі тавараў. Таксама плануецца ўстанавіць адзіныя стаўкі мясцовага падатку з продажаў тавараў у рознічным гандлі і мясцовага падатку на паслугі ў памеры 5 працэнтаў. Акрамя гэтага, з аб'екта абкладання падаткам на нерухомую маёмасць прадугледжваецца выключыць актыўную частку асноўных вытворчых фондаў. Распаўсюджвацца падатак будзе толькі на аб'екты нерухомай маёмасці. Акрамя гэтага, плануецца ўдасканаленне парадку і ўмоў прымянення падаходнага падатку з фізічных асобаў, яго спрашчэнне.

У 2010 годзе прадугледжваецца адмяніць збор у рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, прадуктаў харчавання і аграрнай навукі, а таксама адмяніць мясцовыя мэтавыя зборы з прыбытку, што спаганяюцца па стаўцы 3 працэнты.

**БЕЛТА.**

## Маладажоны верацЬ у шчаслівыя лічбы

**Вузамі Гіменея заўтра, у дзень трох васьмёрак — 08.08.08, маюць намер звязаць сябе каля 300 пар. Жаніхі і нявесты ўпэўненыя, што дзень трох васьмёрак абяцае ім доўгае і шчаслівае сямейнае жыццё.**

У аддзеле ЗАГС адміністрацыі Кастрычніцкага раёна на 8 жніўня 2008 года было пададзена 38 заяў на рэгістрацыю шлюбу. «Гэта некалькі больш, чым звычайна, — адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам агенцтва «Мінск—Навіны» начальнік аддзела ЗАГС Галіна Астахава. — Традыцыйна ў жніўні рэгіструем па 32—33 пары ў дзень».

У Савецкім раёне 8 жніўня абмяняюцца пярсцёнкамі 33 пары, Партызанскім — 28, Заводскім — 33, Маскоўскім — 31, Першамайскім — 34, а ў гарадскім Доме шлюбаў — 27.

Да слова, у кожным ЗАГСе сталіцы першыя пяць пар, якія распішуцца ва ўрачыстых абставінах, атрымаюць арыгінальны падарунак. Маладым уручаць вялікае пясочнае пячэнне ў выглядзе васьмёркі, аблітае шакаладам.

**«Мінск—Навіны».**

## Беларусь прыпыніла работу па размяшчэнні аблігацый на расійскім рынку

Беларусь прыпыніла работу па размяшчэнні аблігацый на расійскім рынку. Аб гэтым паведаміў журналістам першы намеснік міністра фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец.

«Кошт размяшчэння аблігацый на расійскім рынку пакуль што высокі, таму гэты працэс быў прыпынены», — растлумачыў ён, падкрэсліўшы, што калі на рынку складуцца спрыяльныя ўмовы, Беларусь вернецца да разгляду гэтага пытання.

**БЕЛТА**

## Змяненні ў напісанні назваў вуліц будуць уносіцца паступова

Змяненні ў напісанні назваў вуліц па новых правілах беларускай арфаграфіі будуць унесены паступова ў рабочым парадку. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі доктар філалагічных навук прафесар Аляксандр Лукашанец. Ён падкрэсліў, што згодна з законам «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» замена ў напісанні афіцыйных назваў (напрыклад, гарвыканком на гарвыканкам) будзе праводзіцца да 1 верасня 2010 года.

## Крымінал, здарэнні

### ЗЛАДЗЕІ ЎКРАЛІ... МОСТ,

каб здаць яго на метал. Або прадаць патрэбнаму чалавеку. Мост той знаходзіўся на мехдвары КСУП «Усход» Гомельскага раёна, бо ён быў складовай канструкцыяй трактара. Адначасова з ім зніклі ноччу таксама рама пагрузчыка і прыёмная камера камбайна. Міліцыя ўстанавіла, што ногі пералічанаму металу прырабілі двое рабочых прадпрыемства і жыхар вёскі Урыцкае, які раней ужо асуджаўся.

А ў Пакалюбічах таго ж раёна каля кацельні ляжалі два металічныя каўшы коштам каля шасці мільёнаў рублёў, якія належалі таварыству з абмежаванай адказнасцю «Будспецмантажналадка». І яны зніклі той жа самай ноччу. Тут «пастараліся» ўжо два мясцовыя жыхары, якія таксама раней былі асуджаныя, а цяпер нідзе не працавалі і на падмогу сабе ўзялі мужыка, які хацеў так званай грашовай халявы. Узбуджана, як і ў першым выпадку, крымінальная справа.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### «КІНУЎ» «ВІЦЯЗЬ» АМАЛЬ НА 2 МІЛЬЁНЫ ДОЛАРАЎ

У ходзе расследавання крымінальнай справы, узбуджанай у адносінах да 47-гадовага беспрацоўнага, устаноўлена, што ён, калі кіраваў фірмай у Маскве, махлярскім шляхам завалодаў прадукцыяй прадпрыемства «Віцязь» на суму 1 млн 911 тыс. амерыканскіх долараў. Было гэта ў перыяд з пачатку 2005-га па красавік 2006-га гадоў. Нядаўна была ўзбуджана яшчэ адна крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАМЕСТ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ АДКАЗНАСЦІ БУДЗЕ КРЫМІНАЛЬНАЯ

**6 жніўня ў Магілёве затрыманы за хабарніцтва дырэктар гандлёвага прадпрыемства.**

Удзень на Пушкінскім праспекце каля гандлёвага цэнтра «Карусель» 46-гадовы кіраўнік аднаго з гандлёвых прадпрыемстваў абласнога цэнтра спрабаваў перадаць падатковаму інспектару 2 тысячы долараў. Хабар даваўся за тое, каб дырэктара не прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні, звязаныя з захоўваннем тавараў. Цяпер пракуратура распачала крымінальную справу, вядзецца следства.

**Алена КАЗЛОВА.**

### СМЯРОТНЫ ГРЫБ

адзін (або некалькі) апынуўся ў кошыку жыхаркі горада Рагачова. Вечарам лясныя дары былі падсмажаны і апрабаваны ёю і яе мужам, пасля чаго жанчыне стала дрэнна. Яе тэрмінова даставілі ў бальніцу, але ўрачам не ўдалося выратаваць чалавека. Гэта — першае смяротнае атручэнне ад грыбоў на Гомельшчыне.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**




# Стаж для беспрацоўнага

**Я зарэгістраваная ў службе занятасці ў якасці беспрацоўнай і атрымліваю дапамогу па беспрацоўі. Да дасягнення пенсійнага ўзросту мне засталося пяць гадоў. У гэтым узросце нават з дапамогай службы занятасці работу знайсці не так проста. Знаёмая мне сказала, што пакуль я на ўліку як беспрацоўная, то асабліва хвалявацца не трэба, бо гэты час залічваецца ў стаж работы. Ці так гэта?**

**Тамара Васільеўна,** *г. Віцебск*

Перыяды дзейнасці, якія залічваюцца ў стаж работы для прызначэння пенсіі, пералічаны ў артыкуле 51 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні». Згодна з гэтым артыкулам, у стаж работы залічваюцца перыяды работы, прадпрымальніцкай, творчай і іншай дзейнасці пры ўмове, што на працягу гэтых перыядаў адбывалася ўплата абавязковых страхавых узносаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні.

У частцы другой гэтага артыкула пералічаны іншыя перыяды, якія таксама залічваюцца ў стаж работы. Як устаноўлена падпунктам «з» часткі другой, у стаж работы залічваецца перыяд атрымання дапамогі па беспрацоўі, але не больш чым шэсць месяцаў увогуле.

Такім чынам, ваша знаёмая крыху памылілася. У стаж работы вам залічаць не больш за шэсць месяцаў і пры ўмове атрымання ў гэты перыяд дапамогі па беспрацоўі.

У адпаведнасці з пунктам 11 «Інструкцыі аб парадку вядзення працоўных кніжак работнікаў», зацверджанай пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 09.03.1998 г. № 30 са змяненнямі і дапаўненнямі, у працоўную кніжку беспрацоўным, якія атрымліваюць дапамогу па беспрацоўі, з іх згоды ўносіцца запіс адпаведнага зместу па ўстаноўленай форме.

**Могилевский городской исполнительный комитет сообщает о проведении**

**ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА (ПОВТОРНОГО)**

*На право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания здания магазина с мойкой по ул. Криулина*

Кадастровый номер земельного участка: 740100000002004701.
Площадь земельного участка — 0.0621 га. Начальная цена — 15 241 000 рублей. Сумма задатка — 1 524 000 рублей.

***Условия без изменений.***

**Аукцион состоится 21 августа 2008 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией «Центр по землеустройству» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 15 августа 2008 года до 17.00.

**ПРИМЕЧАНИЕ:** ***Полная информация об объекте аукциона и условиях участия в аукционе опубликована 02.07.2008 г. в газете «Звязда» № 122(26235). Тел. в г. Могилеве 8 0222 22 11 63.***

УНП 700008723

**Яршевичский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже 2 (двух) земельных участков для строительства и обслуживания индивидуальных жилых домов:

**Лот 1** — земельный участок в д. Яршевичи, общая площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 622087816101000054, начальная цена — 5 282 500 бел. рублей;

**Лот 2** — земельный участок в д. Яршевичи, общая площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 622087816101000056, начальная цена — 5 282 500 бел. рублей.

Участки размещены на расстоянии 40 км от Минска рядом с автомагистралью Минск — Гродно, имеются сети электроснабжения, водоснабжения, рядом река, лес.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в сумме 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на расчетный счет 3600614180112 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600037328, Яршевичский сельский исполнительный комитет.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 6 сентября 2008 года в 11.00 по адресу: д. Яршевичи, 2, здание сельисполкома.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 05.09.2008 года до 17.00 по адресу: д. Яршевичи, 2, сельисполком, кабинет секретаря. Контактный телефон 8 01772 32 3 36.**

# Інфляцыя за 7 месяцаў — 8,1 працэнта

**Аб гэтым паведаміў міністр статыстыкі і аналізу Уладзімір Зіноўскі.**

Ён нагадаў, што па выніках года інфляцыя прагназавалася на ўзроўні 6—8 працэнтаў. Такім чынам, за 7 месяцаў яна перасягнула прагнозны ўзровень. Паводле слоў Уладзіміра Зіноўскага, гэта абумоўлена ростам сусветных цэнаў на энерганосьбіты, у выніку чаго «мы таксама вымушаны павышаць цэны». Аб'ём прамысловай вытворчасці ў Беларусі па выніках студзеня—ліпеня павялічыўся на 13,1 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, аб'ём вытворчасці сельгаспрадукцыі — на 4,4 працэнта.

**БЕЛТА.**

# Муляр, машыніст і токар

Паводле даных маніторынгу службы занятасці насельніцтва, найбольш запатрабаванымі на айчынным рынку працы зараз з'яўляюцца муляры, машыністы бульдозера і экскаватара, абліцоўшчыкі-плітачнікі і токары. У прыватнасці, як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, зараз па гэтых спецыяльнасцях колькасць заявак ад наймальнікаў перавышае колькасць беспрацоўных у 6—8 разоў. Адначасова сярод прафесій з вышэйшай адукацыяй у лідарах па колькасці вакансій знаходзяцца інжынеры-праграмісты і інжынеры будаўнічага профілю. А вось сярод юрыстаў сітуацыя атрымліваецца процілеглая — у сярэднім 4,35 прэтэндэнта на адну вакансію. Што ж да вёскі, то тут адчуваецца востры недахоп аграномаў, ветурачоў, заатэхнікаў і медыцынскіх работнікаў. Найбольшыя ж цяжкасці з працаўладкаваннем у сельскай мясцовасці сёння маюць настаўнікі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

■ Мінскі маторны завод прадставіў першы айчынны рухавік, які адпавядае экалагічным патрабаванням Еўра-5. Гэты агрэгат быў прадэманстраваны на выстаўцы ў час навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Сучаснае дызелебудаванне. Перспектывы развіцця».

**■ Вытворчае аб'яднанне «Гомсельмаш» у 2009 годзе пачне масавы выпуск камбайнаў КЗ-14 (Палессе GS14). Аб гэтым паведаміў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка, які знаходзіўся сёння з рабочай паездкай у Гомельскай вобласці і знаёміўся з ходам уборкі збожжавых культур у рэгіёне.**



■ Конкурс «Міс Непал» быў адменены з-за пратэстаў жанчын. «Мы не жадаем, каб гэтая падзея адбылася. Нам у новай федэратыўнай дэмакратычнай рэспубліцы Непал не патрэбныя мерапрыемствы, на якіх ствараецца пагроза ўспрымання жанчын як аб'ектаў забавы», — заявіла дэпутат непальскага парламента Амрыта Тапа. Тут называюць конкурсы прыгажосці капіталістычным пеевам і заяўляюць, што аб жанчыне трэба меркаваць па розуме, а не па прыгажосці.

**■ Міністэрства абароны Латвіі мае намер закупіць шаблі на суму 42 тысячы долараў. Усяго Мінабароны набудзе 40 клінкоў — 39 для камандзіраў пяхотных падраздзяленняў і адзін для ВМФ. Такім чынам, адзін клінок абыдзецца прыкладна ў тысячу долараў. Адпаведны тэндар ужо абвешчаны міністэрствам. Шаблі патрэбны латвійскай арміі, колькасць якой складае 5 тысяч чалавек, для парадных мэтаў.**

■ Праца адной са школ у Пуэрта-Рыка была прыпыненая з-за нападу бадзяжных сабак. Колькасць зграі, якая ўварвалася ў школу, складала прыкладна 30 жывёлін. Адзін з сабак накінуўся на школьніка, аднак супрацоўнікі навучальнай установы здолелі адагнаць звера. Пасля гэтага школу часова зачынілі. Да вечара вялікая частка сабак была адлоўленая.

## Поўны абзац



■Вядомы брытанскі тэлевядучы і кулінар папрасіў прабачэння за тое, што па памылцы парэкамендаваў дадаваць у салаты атрутную расліну. У адным з артыкулаў шэф-повар Уорэл Томпсан заявіў, што чорны блёкат, можа паслужыць выдатным дадаткам да летніх страў. Насамрэч чорны блёкат або курыная слепата, як яшчэ называюць расліну, з'яўляецца атрутным і можа выклікаць галюцынацыі, канвульсіі, ваніты, а ў некаторых выпадках прывесці да смяротнага зыходу. Аказалася, што Уорэл Томпсан пераблытаў расліну з іншай, назва якой блізкая па гучанні. Пакуль звестак аб пацярпелых не паступала.

**■ 34-гадовы жыхар Вялікабрытаніі Адам Дзілі загінуў падчас імправізаванага спаборніцтва па запіхванні кексаў у рот. Брытанец падавіўся, спрабуючы з'есці пяць кексаў за адзін раз, і пасля памёр у бальніцы.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

***К сведению акционеров ОАО «Универсам Заславль»:***

в соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» у акционеров, не принявших участие 15 июля 2008 г. во внеочередном общем собрании акционеров ОАО «Универсам Заславль», или голосовавшие против принятия решения по вопросу № 1 повестки дня, имеют право предъявить Обществу требование о выкупе принадлежащих им акций в порядке и на указанных ниже условиях

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение Эмитента-Покупателя (акции которого выкупаются): | Открытое акционерное общество «Универсам Заславль» 220035 г. Минск, пр. Победителей, 49 |
| Адрес, по которому будут приниматься заявления акционеров с требованием выкупа и заключаться договоры купли-продажи акции: | 220036, г. Минск, пер. Северный, д. 13, тел. (8 017) 213 54 72, УП «Совмедиа» — депозитарий |
| Дата начала подачи заявлений и покупки акций | 15.08.2008 |
| Дата окончания подачи заявлений и покупки акций: | 20.09.2008 |
| Цена приобретения акций: | 28 935 белорусских рублей |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций: | в течение 30-и банковских дней с момента зачисления акций на счет «депо» эмитента, денежными средствами за наличный расчет, через кассу общества и/или безналичный расчет, зачислением денежных средств на счета продавцов — физических лиц |
| Условия приобретения акций по требованию акционеров: | ■ список акционеров, акции которых должны быть выкуплены обществом по требованию его акционеров, формируется на основании данных реестра акционеров Общества, сформированного на 11 июля 2008 года. ■ общая сумма денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций по требованию его акционеров, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного Общества на дату принятия настоящего решения. ■ в случае, если общее количество акций, предложенных для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным Обществом с учетом указанного выше ограничения, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям. ■ приобретение акций Обществом по требованию акционеров не осуществляется в случаях установления законодательством соответствующих запретов (ограничений). |

**Документы для оформления сделки вы можете получить по указанному выше адресу. За дополнительной информацией обращаться по тел. (8 017) 213 54 72, 226 61 90 или к администрации ОАО «Универсам Заславль».**

УНН 100008383

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже обращенных в доход государства:**

| № лота | Объект | Общая площадь (кв.м) | Адрес | Начальная цена (снижена на 10 % бел. руб.) | Задаток (от нач. цены) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Уречский цех** | 1746,3 | Минская область, Любанский район, г.п. Уречье, ул. Коммунальная, 9 | 624 240 000 | 5 % |
| | **Цех огнетушителей, склад сои** | 1962,4 | | | |
| | **Котельная** | 200,5 | | | |
| | **Проходная** | 15,2 | | | |
| 2 | **Здание гаража-мастерской** | 1117,8 | г. Слуцк, ул. Ленина, 292 | 237 600 000 | 10 % |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.06.2008 г. **Аукцион состоится 26 августа 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25 августа 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**КУП «Гродненский центр недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно**

| № лота | местонахождение земельного участка | площадь земельного участка (га) | начальная цена продажи (тыс. руб.) | сумма задатка (тыс. руб.) | срок аренды участка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | м-н «Вишневец-4» позиция по генплану № 93 | 0,3002 | 201 000 | 20 100 | 50 лет |
| 2. | ул. Брикеля | 0,5909 | 331 000 | 33 100 | 50 лет |
| 3. | м-н «Барановичи-1» | 0,3427 | 132 500 | 13 250 | 50 лет |
| 4. | м-н «Южный» по ул. Центральная | 0,1825 | 70 000 | 7 000 | 50 лет |
| 5. | м-н «Зарица» | 0,2697 | 25 000 | 2 500 | 50 лет |
| 6. | м-н «Погораны-Кошевники» | 0,7002 | 70 000 | 7 000 | 50 лет |
| 7. | пр-т Я. Купалы | 0,7660 | 750 000 | 75 000 | 50 лет |
| 8. | м-н «Вишневец-2» по пр. Клецкова позиция по генплану № 2Б | 0,1324 | 65 000 | 6 500 | 50 лет |
| 9. | ул. Врублевского | 1,0003 | 486 000 | 48 600 | 50 лет |
| 10. | ул. Пушкина | 0,5046 | 425 000 | 42 500 | 50 лет |
| 11. | на перекрестке ул. Суворова и ул. О. Соломовой | 0,8003 | 415 599,4 | 41 560 | 99 лет |
| 12. | р-н Фолюш на конечной остановке по ул. Репина | 0,4010 | 223 723,7 | 22 372 | 99 лет |
| 13. | по ул. Индурское шоссе на пересечении с ул. Кабяка | 1,0000 | 627 470,4 | 62 747 | 99 лет |

Повторный открытый аукцион по продаже права проектирования и строительства «Многоквартирного жилого дома» на земельном участке площадью 0,3018 га в г. Гродно ул. Академическая, 12. Начальная цена продажи права проектирования и строительства 180 000 000 руб. Ориентировочный размер убытков 156 400 734 руб. Размер задатка 18 000 000 руб.

Подробные извещения и порядок подачи заявлений опубликованы в газете «Гродненская правда» от 26.04.2008 г. и 21.05.2008 г., газете «Звязда» от 26.04.2008 г. и 21.05.2008 г. ***Аукцион состоится 10 сентября 2008 года,*** *в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.* ***Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по 4 сентября 2008 г.*** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. *Адрес сайта: www.gorod.grodno.by*

УНП 590727594

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

8

ЖНІЎНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 31 (15535)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# 85,3 ТЫСЯЧЫ ЛЕПШЫХ АБІТУРЫЕНТАЎ ЗАЛІЧАНЫ Ў ВНУ КРАІНЫ

**ЯК ШМАТ НЕЗАДАВОЛЕНЫХ ХОДАМ ПРАВЯДЗЕННЯ ЎСТУПНЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ?**

— За ходам правядзення ўступнай кампаніі назіралі, акрамя Дзяржаўнай камісіі, яшчэ і рабочыя групы, створаныя пры кожнай навучальнай установе, — гаворыць ***першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў у 2008 годзе ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Анатоль РУБІНАЎ***. — Галоўнай мэтай было не дапусціць, каб, робячы першыя крокі ў дарослае жыццё, маладыя людзі сутыкнуліся з сацыяльнай несправядлівасцю. Гэтаму ўжо не першы год спрыяе цэнтралізаванае тэсціраванне, якое, у адрозненне ад стандартных экзаменаў, поўнасцю пазбаўлена элементаў суб'ектывізму. Але, безумоўна, незадаволеныя заўсёды былі і будуць. Напрыклад, хацеў абітурыент атрымаць 300 балаў, а набраў у суме толькі 140. Ён жа не скажа, што сам вінаваты, недавучыў, а будзе пераконваць бацькоў і сяброў у тым, што тэсты ў гэтым годзе празмерна складаныя. Насамрэч тэставыя заданні не выходзілі за школьную праграму, проста яны ў кожным варыянце былі рознага ўзроўню складанасці (ад элементарных да такіх, дзе трэба прымяняць веды па прадмеце ў сукупнасці). Як паказвае аналіз работ, некаторыя абітурыенты не спраўляліся нават з элементарнымі заданнямі. Гэта сведчыць аб тым, што нізкі бал атрымаў той, хто не валодаў нават базавымі ведамі.

— Радуе, што людзі сталі больш граматнымі, — дадае ***міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ***. — Большасць задоўга да пачатку прыёмнай кампаніі азнаёміліся з правіламі прыёму ў ВНУ. Аб гэтым сведчыць тое, што ў два разы менш зваротаў стала паступаць на гарачую лінію. Але ж ёсць і такія, хто яшчэ сёння хоча прайсці субяседаванне на прадмет прафесійнай прыгоднасці (якое, як вядома, прайшло ў маі).

Паводле слоў Аляксандра Радзькова, у апошнія гады ў нашай краіне назіраецца ўстойлівы попыт на адукацыю, перш за ўсё на вышэйшую.

— З 90 тысяч выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў гэтага года ажно 80 тысяч здавалі цэнтралізаванае тэсціраванне, 38 працэнтаў ад агульнай колькасці тэсціруемых — выпускнікі ССНУ і ПТВ. Гэта ў чарговы раз даказвае, што людзі разумеюць: адукаваны спецыяліст хутчэй і лепш за чалавека без дыплома знойдзе сваё месца пад сонцам. Але, згадзіцеся, нават тэарэтычна ўсе ахвотныя не змогуць паступіць у ВНУ, таму бацькі і настаўнікі павінны арыентаваць свайго выхаванца на тое, каб ён вымяраў свае магчымасці з рэальнымі патрабаваннямі. Самае галоўнае, на мой погляд, каб юнак ці дзяўчына былі ўладкаваныя ў жыцці, і не так важна, будзе гэта ВНУ, ССНУ ці ПТВ.

**— У параўнанні з мінулым годам прыём на месцы, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, павялічыўся на 410 месцаў, з іх 379 было дабаўлена на дзённую форму навучання...**

— З улікам аналізу патрэбаў эканомікі рэспублікі ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй павялічыўся прыём на спецыяльнасці накірунку «Вылічальная тэхніка» (на 8 працэнтаў), «Энергетыка» (на 9,3 працэнта), спецыяльнасці медыцынскага профілю (амаль на 13 працэнтаў), будаўнічага профілю (на 7 працэнтаў), — адзначыў Аляксандр Радзькоў. — Разам з тым быў скарочаны прыём абітурыентаў на навучанне за кошт сродкаў бюджэту на педагагічныя, юрыдычныя і эканамічныя спецыяльнасці.

Акрамя таго, сёлета шэраг ВНУ ўпершыню пачнуць ажыццяўляць падрыхтоўку спецыялістаў па новых спецыяльнасцях (накірунках спецыяльнасцяў, спецыялізацыях), перш за ўсё для атамнай энергетыкі: «Будаўніцтва цеплавых і атамных электрастанцый», «Паратурбінныя ўстаноўкі атамных электрычных станцый (БНТУ); «Фізіка ядзерных рэактараў і атамныя энергетычныя ўстаноўкі» (БДУ); «Ядзерная і радыяцыйная бяспека» (МДЭУ імя А. Сахарава). Як і летась высокую цікавасць праяўляюць абітурыенты да спецыяльнасцяў тэхнічнага, будаўнічага, тэхналагічнага профіляў, інфармацыйных тэхналогій, энергетыкі, аб чым сведчыць рост конкурсу і дастаткова высокія прахадныя балы (ад 200 да 300 і вышэй). Не страчваюць папулярнасць і такія спецыяльнасці, як «Правазнаўства», «Эканоміка», «Дзяржаўнае кіраванне», «Міжнародныя адносіны», «Замежныя мовы», «Турызм і гасціннасць» не толькі ў сталічных, але і ў рэгіянальных ВНУ.

**ЯКІЯ ДАПАЎНЕННІ СЁЛЕТА БЫЛІ ЎНЕСЕНЫ Ў ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ?**

— У гэтым годзе ў якасці дапаўненняў да Правілаў прыёму ў ВНУ была ўведзена плата (грошы гэтыя пойдуць на аплату працы тых людзей, якія штогод удасканальваюць тэставыя заданні) за рэгістрацыю для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, — гаворыць Анатоль Рубінаў. — Гэта, як мы і прагназавалі, паменшыла колькасць людзей, якія здавалі тэсты, толькі каб праверыць узровень ведаў (вучні старэйшых класаў, іх настаўнікі і бацькі).

— Акрамя таго, падчас уступнай кампаніі выявіліся спрэчныя моманты, якія мы будзем абмяркоўваць і, магчыма, вырашым да чарговага «гарачага» сезону, — падкрэсліў Анатоль Рубінаў. — Папершае, трэба ўважліва прааналізаваць сітуацыю з ніжняй мяжой балаў (калі адзнака лічыцца адмоўнай і сертыфікат не выдаецца на рукі). У гэтым годзе мы сутыкнуліся з тым, што па некаторых прадметах вынік значнай часткі тэстаў аказаўся ніжэйшы за тую планку, якую мы паставілі першапачаткова. Па-другое, прыёмныя камісіі скардзяцца на тое, што апошні дзень падачы дакументаў нагадвае балаган. Бацькі і абітурыенты, спрабуючы заскочыць «у апошні вагон», падаюць дакументы на выбраную ў апошні момант спецыяльнасць. Любая ж навучальная ўстанова зацікаўлена ў тых студэнтах, якія зрабілі свядомы выбар задоўга да падачы дакументаў.

Прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне — прапускны білет на некаторыя спецыяльнасці — яшчэ адно новаўвядзенне гэтага года. Яно было ўведзена для таго, каб дапамагчы абітурыенту, пакуль не позна, пераканацца ў сваім выбары, а выкладчыкам зразумець, ці адпавядае патэнцыяльны студэнт патрабаванням выбранай прафесіі. Напрыклад, у дзяўчынкі, якая вырашыла паступаць на факультэт міжнародных адносінаў, спыталі, з якімі краінамі мяжуе Беларусь. Яна, на жаль, змагла назваць толькі Расію...

**— Паводле статыстыкі, сярэдні конкурс па рэспубліцы складае 2,1 чалавека на адно бюджэтнае месца...**

— Так, — пацвердзіў Аляксандр Радзькоў. — Але трэба разумець, што сярэдні конкурс у ВНУ страціў сваю актуальнасць. У сувязі з тым, што зараз спачатку здаюцца выпрабаванні, а пасля падаюцца дакументы (раней мы спачатку выбіралі навучальную ўстанову, а пасля падавалі туды дакументы і здавалі экзамены). Зараз жа кожны абітурыент да апошняга дня прыёму дакументаў мае магчымасць разлічваць свае шанцы на паступленне ў тую ці іншую навучальную ўстанову. Таму асноўнае значэнне ў час уступнай кампаніі сёння маюць менавіта набраныя абітурыентамі падчас цэнтралізаванага тэсціравання балы (прахадны бал).

Так, напрыклад, прахадны бал у БДУ на факультэце прыкладной матэматыкі склаўся на 314 узроўні (конкурс 1,7 чалавека на месца). Але маленькі конкурс зусім не значыць, што на гэты факультэт было лёгка паступіць (проста туды падавалі дакументы толькі тыя абітурыенты, якія набралі 314 і больш балаў). Тым больш ФПМ карыстаецца сярод маладых людзей вялікай папулярнасцю, там вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі: каманда БДУ заняла 6-е месца па праграмаванні сярод камандаў усяго свету.

Адным словам, шырокае ўкараненне цэнтралізаванага тэсціравання, завяршэнне ўступных выпрабаванняў на многія спецыяльнасці да пачатку прыёму дакументаў у ВНУ, адкрытасць і даступнасць (у рэжыме «on-line») інфармацыі аб конкурсе, які складваецца, і прахадным бале на спецыяльнасці стварылі ўмовы для свабоднага, усвядомленага выбару абітурыентамі ўстаноў адукацыі, будучай спецыяльнасці і формы атрымання адукацыі.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Крышку статыстыкі

У дзяржаўныя ВНУ на дзённую форму навучання на бюджэтнай аснове было пададзена больш як 51 тысяча заяў. Па выніках залічэння студэнтамі дзяржаўных ВНУ дзённай формы навучання на бюджэтнай аснове сталі 23 783 чалавекі. Без уступных экзаменаў прынялі 277 чалавек (205 — пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд, творчых конкурсаў; 45 — пераможцы і прызёры спартыўных спаборніцтваў; 3 — лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). 479 чалавек залічаны па-за конкурсам (амаль у два разы менш у параўнанні з мінулым годам, што звязана са скарачэннем ільготных катэгорый абітурыентаў), з іх 435 — дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў.

За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту вышэйшую адукацыю атрымаюць на дзённай форме больш як 20 тысяч выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў адукацыі гэтага года, з іх 16 036 — гарадскія выпускнікі, 4 053 — выпускнікі сельскіх устаноў адукацыі. З кожным годам павялічваецца працэнт першакурснікаў — выпускнікоў сельскіх агульнаадукацыйных школ. У гэтым годзе яны склалі амаль 20 працэнтаў.

## ГРАШОВЫЯ ПРЭМІІ — АДОРАНЫМ СТУДЭНТАМ

Грашовымі прэміямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў заахвочаны 1394 пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па агульнаадукацыйных прадметах, а таксама рэспубліканскіх канферэнцый, конкурсаў і турніраў. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацвердзіў рашэнне савета фонду.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## А Ў ХАЛАДЗІЛЬНАЙ ШАФЕ, МІЖ ІНШЫМ...

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці праверылі работу дзесяці летніх аздараўленчых лагераў .

У лагеры «Юны хімік» Гомельскага хімічнага завода ў 129 порцыях салаты, кашы і бефстроганава не дакладалася ад 11 да 25 грамаў ежы, а ў «Ліцэйшчыку» завода «Цэнтраліт» у правераных 130 порцыях плову ўтрыманне тлушчу і маса так званых сухіх рэчываў складалі адпаведна 70,2 і 80,2 працэнта да нормы. Затое там і там былі знойдзены прыхаваныя і мяса, і масла, і цукар, і мандарыны. Сем чалавек вызвалены ад пасад, а 14 — аштрафаваны на 3,1 мільёна рублёў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# КОЖНЫ ДЗЕНЬ — ЭКСТРЫМ

***Каля сталічнага Палаца спорту з'явілася яшчэ адно месца для актыўнага адпачынку моладзі – пляцоўка для экстрэмальных відаў спорту. Кожны вечар хлопцы і дзяўчаты не толькі катаюцца на скейтах, роліках і веласіпедах, але і паказваюць складаныя трукі.***





Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ



Алеся Чарняўская:

# «Суддзя павінен умець чытаць думкі, а трэнер — быць дыктатарам»

**Самая тытулаваная айчынная таэквандыстка Алеся Чарняўская закончыла спартыўную кар'еру. Замест пуцёўкі на алімпіяду на адборачным турніры яна атрымала дзве сур'ёзныя траўмы, якія і сталі апошнімі на яе спартыўным шляху. Але канчаткова развітацца са спортам таэквандыстка не здолела. Цяпер на спаборніцтвах Алеся прадстала ў новым амплуа, якое, дарэчы, дазваляе ёй без лішняй сціпласці патэлефанаваць у рэдакцыю: «Наша каманда добра выступіла на чэмпіянаце свету, напішыце...» На інтэрв'ю спартсменка прыязджае ў суправаджэнні маладога чалавека і пра асабістае расказваць адмаўляецца. А што расказваць, калі і так усё бачна? Парадуемся за Алесю.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

**— Што за спаборніцтвы, пра якія ты хацела расказаць?**

— Нядаўна праходзіў чэмпіянат свету сярод ваеннаслужачых. Спаборніцтвы былі ў Паўднёвай Карэі, на ваеннай базе каля Сеула. Пазнаёміліся з мясцовым армейскім бытам. Кармілі выдатна. Магчыма, салдатаў і не так кормяць. Цікава, што трапляеш не як звычайны турыст ці спартсмен, якія бачаць горад ці спартыўную залу. Тут іншае, не кожны зможа знутры паглядзець, як жывуць ваенныя. Як у кіно «Салдаты», толькі на замежнай мове. Удзельнічала 37 краін. Ад Беларусі ездзілі 9 спартсменаў: трое дзяўчат і шэсць мужчын. Света Аксёнава і Юля Смычкова занялі трэція месцы, «серабро» заваяваў Ігар Расахацкі, прычым у паўфінале ён выйграў у карэйца. Мала таго, што карэйцы — роданачальнікі гэтага віду спорту, дык яшчэ і чэмпіянат праходзіў у іх на радзіме. Яго праціўніку не патрэбна была акліматызацыя, у адрозненне ад нас — мы праляцелі ўсе часавыя паясы. Усё павінна было сыграць на карысць карэйца, але атрымалася інакш.

**— Якое дачыненне да гэтых спаборніцтваў маеш ты?**

— Ніякага. Вось іх бы і паклікалі на інтэрв'ю. Хоць я таксама туды ездзіла — судзіць. Але нашым не падсуджвала. Мы не можам судзіць сваіх спартсменаў. Я не магу выступаць, таму некалькі спаборніцтваў наведала як турыст, а цяпер вось як суддзя.

**— Як адбывалася развітанне з вялікім спортам?**

— Цяжка. Але так вырашылі дактары. З апошніх спаборніцтваў, дзе я павінна была браць алімпійскую ліцэнзію, я вярнулася са зламанымі рукамі. Але я ўсё яшчэ дзесьці побач са спортам. Таэквандо займалася 17 гадоў — больш за палову жыцця. Пакуль дзеці, якіх я трэнірую, маленькія, можна паездзіць па спаборніцтвах у якасці суддзі, вывучыць усе тэндэнцыі, змяненні ў правілах. А потым, як вучні вырастуць, будуць самі, спадзяюся, удзельнічаць у чэмпіянатах свету. На наступныя алімпійскія гульні выхаванцаў, напэўна, яшчэ не паспею падрыхтаваць, толькі суддзёй можна паехаць.

**— Суддзёй так проста стаць?**

— Няпроста, гэта мне так падфарціла. У Беларусі ўсяго 5 суддзяў міжнароднай катэгорыі, што, дарэчы, немалаважна для нашых спартсменаў.

**— Нервовы занятак?**

— Спачатку я ўсё вельмі блізка да сэрца ўспрымала. Але пакуль яшчэ я нікога не засудзіла. Можна, вядома ж, выпадкова не тую кнопку націснуць. Але бал прысуджаецца, калі трое суддзяў з чатырох націскаюць кнопкі. Калі адзін суддзя памыліўся, нічога страшнага. Мяне, напрыклад, яшчэ не лаялі ні за што. Падказвалі, калі першы раз судзіла. Дакладней сказалі, што я ўвогуле няправільна суджу. «Чаму?» — пытаю. «Ты глядзіш не як суддзя, а як спартсмен — быццам бы сама хочаш ударыць». А суддзя павінен сачыць, хто дзе парушае правілы і як гэта спыніць.

**— Ці не з'яўляецца спакуса адпомсціць сваім саперніцам цяпер, калі ты выступаеш у ролі суддзі?**

— На любых спаборніцтвах усе сябруюць. Пасля паядынку сапернікі пакланяліся адзін аднаму, паціснулі рукі і мірна разышліся. Так адбываецца нават у самых зверскіх відах спорту. Крыўда можа быць на суддзяў, на трэнера, які не так трэніраваў ці падказваў, на сябе, але не на праціўніка. Сапернік жа выконвае сваю работу. Я ні на каго са сваіх саперніц не крыўджуся. Крыўдна толькі, што ў сваёй кар'еры адной англічанцы я прайграла тры разы. Праўда, спачатку з вялікім разрывам у ліку, потым з меншым, і апошні раз з мінімальным. І кожны раз здавалася: ну, усё, зараз ужо выйграю. Але ўсе тры разы я сустрэлася з ёй у паўфіналах, і ў мяне ўжо было суцяшэнне — бронзавы медаль. А калі цяпер быў адборачны турнір, я больш за ўсіх за англічанку перажывала і хварэла. Так што нічога асабістага.

**— Цябе засуджвалі?**

— Пару разоў так казалі трэнеры. Але я не прыслухоўвалася да гэтага меркавання. Нават калі гэта і так, трэба не ў іншых шукаць прычыну паражэння, а ў сабе. Інакш нічога не атрымаецца. Дапусцім, не залічылі адзін удар — яшчэ раз можна ўдарыць, яшчэ і яшчэ.

**— Наколькі таэквандо суб'ектыўны від спорту?**

— Мастацкая гімнастыка, напрыклад, больш суб'ектыўны. У таэквандо як бы ні хацелі засудзіць, калі ты нашмат мацнейшы за саперніка, то ты выйграеш. А калі спартсмены роўныя, а на высокім узроўні пераважна ўсе роўныя, то тут любая заўвага суддзі важная, і гэтай невялікай перавагі для перамогі дастаткова. У нас у правілах запісана: калі спартсмен упаў наўмысна, то гэта заўвага, калі не наўмысна — не парушэнне. І суддзі павінны чытаць думкі — задумваў спартсмен падзенне ці проста так кінуў дзве нагі ў паветра і разлічваў працягваць паядынак. Хоць з суб'ектывізмам змагаюцца — усе дзеянні суддзі, напрыклад, фіксуюцца ў камп'ютары, і калі ты ўвесь час будзеш націскаць толькі ў адзін бок, а выйграе іншы, па меншай меры выглядаць гэта будзе дзіўна.

**— Цяпер з'явілася шмат вольнага часу. Чым яго запаўняеш?**

— Сорамна сказаць, нічым увогуле. Рукі яшчэ не да канца зажылі. Перад апошнім візітам у дыспансэр я чакала, што мне скажуць, што ўсё там добра. Але высветлілася, што нічога там добрага няма. Тры месяцы таму павінна было ўсё зажыць. Але дагэтуль рукі не згінаюцца. Я прызвычаілася, пазногці вось нарасцілі. Да адборачнага турніру ў мяне была добрая падрыхтоўка і я разлічвала яшчэ на чэмпіянаце Еўропы выступіць. Вось чатыры гады таму я рыхтавалася-рыхтавалася да адборачнага турніру і не ўзяла ліцэнзію, а потым на чэмпіянаце Еўропы раз — і першае месца.

Калі б адну руку зламала, я яшчэ пачакала б, калі зажыве, і пайшла б далей. А так прыехала з двума гіпсамі і падумала, што, магчыма, гэта мне такі намёк, што час заканчваць са спортам. Я так заўсёды сябе супакойваю. Едзеш, забудзеш павярнуць, ну, не будзеш жа сябе вінаваціць. І я думаю: а раптам там штосьці магло здарыцца, значыць мне не трэба было там ехаць.

**— Які ў цябе вадзіцельскі стаж?**

— Пачыналася ўсё дзесьці з 2001 года. Змяніла некалькі машын. Зараз у мяне «Форд Фугра». Машына вельмі прыгожая, праўда, запчастак на яе не могуць знайсці.

**— А суддзі як зарабляюць?**

— Не заўсёды міністэрства зацікаўлена цябе кудысьці накіроўваць. Калі чэмпіянат свету, ці вось чэмпіянат свету сярод ваеннаслужачых, Міністэрства спорту камандзіруе каманду спартсменаў і мяне, як суддзю. Гэта значныя міжнародныя спаборніцтвы, маецца на ўвазе прэстыж краіны. А на іншыя турніры... Я, магчыма, і на ўсе б ездзіла — і ў Зімбабвэ, і ў Акапулька...

**— Што робіш, каб падтрымліваць сябе ў форме?**

— Нічога. Мне трэба трэніравацца, рэзка завязваць са спортам нельга. Я і планавала, што буду з 1 сакавіка займацца фізкультурай, потым з першага красавіка, мая... Калі трэніруешся для таго, каб выйграць спаборніцтвы, гэта лёгка. А цяпер трэніравацца дзеля чаго? Ну, для здароўя. Не ведаю, ці здолею я, пакуль не магу сябе прымусіць. Спадзяюся, што ў хуткім часе займуся. Усё паспрабую — басейн, трэнажорную залу, пагляджу, што мне спадабаецца. Я ў дзяцінстве шмат чым займалася, у тым ліку і мастацкай гімнастыкай, і фігурным катаннем. Так што ў гэтым плане мне няма аб чым шкадаваць.

**— Якія-небудзь спаборніцтвы глядзіш па тэлевізары?**

— Любыя магу паглядзець. Але спецыяльна ні за чым не сачу. Таэквандо, дарэчы, здаецца, усяго два разы паказвалі ў нас па тэлебачанні — чэмпіянат свету 2005 года і Ўніверсіяду. Крыўдна...

**— Трэніраваць дзяцей проста ці складана?**

— Дзеці яшчэ маленькія. Слухаюцца, але часам я сама дазваляю ім сваволіць — лічу, гэта нармальна. Бываюць такія дні, калі яны ўсё злёту разумеюць, што сама дзіву даешся, а на наступны нічога не хочуць рабіць. «Ну і добра, — думаю. — Яны ж учора такія малайцы былі, няхай сёння сваволяць». Хоць гэта зараз я такая добранькая — калі рыхтавалася да адбору, не трэніравала і засумавала па гэтай рабоце. Звычайна на трэніроўках я дыктатар.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# МЫ ТАКІЯ РОЗНЫЯ, МЫ ТАКІЯ ПАДОБНЫЯ

**У полькі Марлены, расіянкі Тані і беларускі Насці, якія разам адпачывалі ў міжнародным лагеры «Зямля — наш агульны дом» у Маладзечне, шмат падобнага. Кожнай з іх застаўся роўна год да паступлення ва ўніверсітэт, усе яны пагарджаюць абцасамі і вядуць актыўнае жыццё: Марлена займаецца валейболам, Насця ездзіць на турзлёты, а Таня гуляе ў «Што? Дзе? Калі?» і нават брала ўдзел у школьным чэмпіянаце Расіі. Але на самыя простыя пытанні дзяўчаты адказваюць зусім па-рознаму. Вось і думай: сёстры нашы краіны — Беларусь, Расія і Польшча — ці ўсё ж суседкі?**

*1) Як ты звычайна спраўляеш Новы год?*

*2) Паміж кнігай і Інтэрнэтам ты выбераш...*

*3) Як часта ты просіш дапамогі ў Бога?*

*4) Што больш важна для жанчыны: сям'я ці кар'ера?*

*5) Ці існуюць пытанні, якія ты не можаш абмеркаваць са сваімі бацькамі?*

*6) Якую рэч ты не можаш сабе дазволіць з-за яе дарагоўлі?*

*7) Якой ты бачыш праз пяць гадоў сябе і сваю краіну?*

Марлена Барцэвіч, вучаніца 3-га класа агульнаадукацыйнага ліцэя імя Мікалая Каперніка ў горадзе Сакулка (Польшча, Беластоцкае ваяводства):

1) Новы год мы з сяброўкамі звычайна адзначаем у клубе, падарункамі не абменьваемся. Куды больш значнае свята для нас — Ражство. Да яго доўга і старанна рыхтуемся ўсёй сям'ёй, складаем меню, каб на стале абавязкова было 12 страў, сярод якіх — ніводнай мясной. Вось тут падарункі якраз да месца.

2) Інтэрнэт. Я люблю чытаць артыкулы на інфармацыйных сайтах: паўгадзіны — і ты ў курсе ўсіх падзей у свеце.

3) Я заўсёды малюся два разы на дзень — зранку і ўвечары. У касцёле бываю кожную нядзелю і вельмі перажываю, калі штосьці перашкаджае туды схадзіць. На споведзі абавязкова ўспамінаю пра гэты грэх.

4) Сям'я. Калі мой муж скажа: «Марлена, сядзі дома і вары капусту», я так і буду рабіць.

5) На далікатныя тэмы лепш пагавару з сяброўкамі. Вядома ж, маці цікавіцца, з якімі хлопцамі я сябрую, але ў падрабязнасці не ўдаецца.

6) Дарагі мабільнік мне не патрэбен. А вось ад падарожжаў я не адмовілася б. Асабліва хочацца паглядзець Лондан. Пакуль была толькі ў Беларусі і Славакіі.

7) Я хачу вучыцца на завочным аддзяленні і адначасова працаваць. У Польшчы студэнты, якія паступілі ў педагагічны інстытут, з першага курса маюць права выкладаць дысцыпліну, па якой у іх стаіць самая высокая адзнака ў «мацуры» — атэстаце сталасці. Думаю, давядзецца змяніць свой знешні выгляд і адмовіцца ад джынсаў і красовак: у нас у краіне настаўніцы заўсёды ходзяць у касцюмах і на абцасах.

Хачу, каб за пяць гадоў у Польшчы з'явілася многа новых помнікаў і цікавых будынкаў, такіх, як ваша Нацыянальная бібліятэка.

Таццяна Швакіна, 11-класніца гімназіі № 8 горада Каломна (Расія, Маскоўская вобласць):

1) Мы з бацькамі абавязкова ставім ёлку, упрыгожваем яе цацкамі, якія засталіся яшчэ з часоў іх дзяцінства — вавёрачкамі, зайчыкамі. Каронная страва на нашым стале — бліны з начынкай з пюрэ і грыбоў. Ласуемся блінамі, глядзім «Блакітны агеньчык». А ў поўнач кладзём пад ёлку падарункі адзін аднаму. Пасля цырымоніі абмену прэзентамі я разам з сябрамі іду на гарадскую ёлку.

2) Кнігу. Інтэрнэт — рэч даволі шкодная: там многа «смецця», ды і зрок ад яго садзіцца. У сярэднім я праводжу дзве-тры гадзіны ў дзень за камп'ютарам і столькі ж — за чытаннем. Апошняя кніга, якую я трымала ў руках, — «Код да Вінчы», а мой любімы твор — «Эра міласэрнасці» братоў Вайнераў, я часта яго перачытваю. Упэўнена, што выбар маіх бацькоў таксама быў бы за кнігамі. Тым больш што мама карыстацца Інтэрнэтам не ўмее. А вось бацька — пісьменнік Сяргей Чаркізаў — часта шукае ў віртуальнай прасторы інфармацыю для сваіх гістарычных раманаў.

3) У мяне да рэлігіі такое ж стаўленне, як і да кніг Пялевіна: даўно хачу пазнаёміцца бліжэй, але ніяк не даходзяць рукі. У царкву хаджу рэдка, з малітваў ведаю толькі «Ойча наш».

4) Трэба ўмець сумяшчаць сям'ю і работу. Калі не ленавацца і старацца ўсё паспець, працаваць з поўнай аддачай, — усё атрымаецца.

5) З матуляй я магу абмеркаваць усё: і мае праблемы, і знаёмых юнакоў. Што датычыцца сямейных пытанняў, то мой голас заўсёды ўлічваецца.

6) Супердарагое адзенне мяне ніколі не вабіла. Больш за тое, я люблю ствараць убранні сама: з вялікім задавальненнем нашу гавайскую кашулю, перашытую з татавай, майку, на якой акрылавымі фарбамі напісала: «Don't cry, Tanya!» А што я не магу сабе дазволіць — дык гэта падарожжы. Вельмі хацелася б пабачыць Англію, Францыю, Галандыю. Пакуль з замежных краін я была толькі ў Беларусі.

7) Калі ўсё складзецца добра, праз пяць гадоў я ўжо буду на чацвёртым курсе журфака. Планую сумяшчаць вучобу і работу. Прычым працаваць я мару ў Маскве, у часопісе «Русский репортер», а жыць — у Каломне, тут чысцей. Думаю, за гэты час мой знешні выгляд не зведае вялікіх змен: кеды, джынсы, вялікая сумка — лепшая экіпіроўка для журналіста. А замуж я хачу выйсці курсе на пятым. З'яўленне першага дзіцяці плануе гады праз тры.

Спадзяюся, што ў Расіі за гэты час адменяць новаўвядзенне нашай сістэмы адукацыі — адзіны дзяржаўны экзамен, якога я вельмі баюся, і што расіяне стануць крышачку дабрэйшым.

Настасся Дайноўская, вучаніца 11-га класа сярэдняй школы № 8 горада Маладзечна (Беларусь, Мінская вобласць):

1) Да поўначы — з бацькамі, пасля — з сябрамі. Дома ставім штучную ёлку, смажым курыцу. Што мне падарылі бацькі на апошні Новы год? Не памятаю. Здаецца, грошы.

2) Кнігу: электронныя старонкі ніколі не заменяць шамацення папяровых лістоў. Больш за ўсё люблю «Рамэо і Джульету» Шэкспіра — пэўна, сто разоў ужо перачытвала.

3) Я для сябе яшчэ не вырашыла, веру ў Бога ці не... А маліцца — не малюся, бо ніводнай малітвы не ведаю.

4) Хацелася б спачатку зрабіць кар'еру і толькі потым ствараць сям'ю.

5) З бацькамі я не вельмі гаваркая. Хоць вельмі хацела б, каб мама была мне яшчэ і сяброўкай.

6) Не магу дазволіць сабе падарожжа, напрыклад, у Парыж. За мяжой пакуль ні разу не была.

7) Праз пяць гадоў я буду вучыцца і працаваць. Сям'ю я гатова стварыць, як толькі сустрэну свайго чалавека.

Хачу, каб у Беларусі вярнулі хоць частку льготаў для студэнтаў і школьнікаў і паклалі нармальны асфальт на маёй вуліцы.

**Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота аўтара.**



**Марлена БАРЦЭВІЧ, Таццяна ШВАКІНА і Настасся ДАЙНОЎСКАЯ ўпэўненыя, што розныя нацыянальнасці — не перашкода для сяброўства.**

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года*

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні**

1. Акрэдытацыя журналіста сродку масавай інфармацыі — пацвярджэнне права журналіста сродку масавай інфармацыі асвятляць мерапрыемствы, якія арганізуюцца дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі юрыдычнымі асобамі, а таксама іншыя падзеі, што адбываюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за яе межамі.

2. Від сродку масавай інфармацыі — газета, часопіс, бюлетэнь, радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальная праграма, іншая сукупнасць інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў (перадач), якія носяць перыядычны характар і прызначаны для няпэўнага кола асобаў.

3. Відэа-, кінахранікальная праграма — сукупнасць аўдыя-, аўдыявізуальных інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў (перадач), якія маюць пастаянную назву і носяць перыядычны характар.

4. Выпуск сродку масавай інфармацыі — выхад у свет друкаванага сродку масавай інфармацыі, сродку масавай інфармацыі, які распаўсюджваецца праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт, або выхад у эфір тэлевізійнага, радыёвяшчальнага сродку масавай інфармацыі.

5. Галоўны рэдактар (рэдактар) сродку масавай інфармацыі — кіраўнік юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, або ўпаўнаважаная ім асоба.

6. Журналіст замежнага сродку масавай інфармацыі — фізічная асоба, якая займаецца зборам, рэдагаваннем і стварэннем (падрыхтоўкай) інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў для юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, зарэгістраванага за межамі Рэспублікі Беларусь, якая звязана з гэтай юрыдычнай асобай працоўнымі адносінамі і мае акрэдытацыю ў Рэспубліцы Беларусь.

7. Журналіст сродку масавай інфармацыі — фізічная асоба, якая займаецца зборам, рэдагаваннем і стварэннем (падрыхтоўкай) інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў для юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, звязаная з гэтай юрыдычнай асобай працоўнымі або іншымі дагаворнымі адносінамі.

8. Замежны сродак масавай інфармацыі — сродак масавай інфармацыі, зарэгістраваны за межамі Рэспублікі Беларусь.

9. Інфармацыйнае агенцтва — юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе збор, стварэнне (падрыхтоўку), захоўванне інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў і іх распаўсюджанне ў сродках масавай інфармацыі і мае адначасова статус юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, і распаўсюджвальніка прадукцыі сродку масавай інфармацыі.

10. Карэспандэнцкі пункт — адасобленае падраздзяленне юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі і якое ажыццяўляе збор, захоўванне і стварэнне (падрыхтоўку) інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў для дадзенага сродку масавай інфармацыі, а таксама распаўсюджванне яго прадукцыі.

11. Масавая інфармацыя — прызначаныя для няпэўнага кола асобаў друкаваныя, аўдыя-, аўдыявізуальныя і іншыя інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, апублікаваныя ў друку, паведамленыя пры дапамозе тэлевізійнага вяшчання і радыёвяшчання або ў іншай форме перыядычнага распаўсюджання.

12. Недакладная інфармацыя — інфармацыйныя паведамленні, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, і (або) матэрыялы, што распаўсюджваюцца сродкам масавай інфармацыі.

13. Перыядычнасць сродку масавай інфармацыі — выпуск сродку масавай інфармацыі пэўную колькасць разоў праз пэўны прамежак часу.

14. Друкаваны сродак масавай інфармацыі — газета, часопіс, бюлетэнь, іншае выданне, якія маюць пастаянную назву, парадкавы нумар, скразную нумарацыю старонак і выходзяць у свет не радзей за адзін раз у шэсць месяцаў.

15. Прадукцыя сродку масавай інфармацыі — тыраж (частка тыражу) асобнага нумара друкаванага сродку масавай інфармацыі, асобны выпуск радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальнай праграмы, тыраж або частка тыражу аўдыя- або відэазапісу праграмы, а таксама інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, якія распаўсюджваюцца ва ўстаноўленым парадку праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт.

16. Радыё-, тэлепраграма — сукупнасць аўдыя-, аўдыявізуальных інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў (радыё-, тэлеперадач), якія маюць пастаянную назву і носяць перыядычны характар.

17. Радыёвяшчальны сродак масавай інфармацыі — радыёпраграма, якая распаўсюджваецца з выкарыстаннем сродку электрасувязі не радзей за адзін раз у шэсць месяцаў.

18. Распаўсюджанне прадукцыі сродку масавай інфармацыі — продаж, падпіска, дастаўка друкаванага сродку масавай інфармацыі, аўдыя- або відэазапісаў праграм, трансляцыя і рэтрансляцыя радыё-, тэлепраграм, дэманстрацыя кінахранікальных праграм, іншая форма давядзення масавай інфармацыі да ўсеагульнага ведама.

19. Распаўсюджвальнік прадукцыі сродку масавай інфармацыі — юрыдычная або фізічная асоба, якая ажыццяўляе распаўсюджванне прадукцыі сродку масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Сродак масавай інфармацыі — форма перыядычнага распаўсюджання масавай інфармацыі з выкарыстаннем друку, тэлевізійнага вяшчання і радыёвяшчання, глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт.

21. Суб'екты праваадносінаў у сферы масавай інфармацыі — рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі, грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі, заснавальнік (заснавальнікі), галоўны рэдактар (рэдактар), журналіст сродку масавай інфармацыі, юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, а таксама інфармацыйнае агенцтва, карэспандэнцкі пункт, распаўсюджвальнік прадукцыі сродку масавай інфармацыі.

22. Тэлевізійнае вяшчанне і радыёвяшчанне — распаўсюджанне масавай інфармацыі з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў вяшчання для індывідуальнага або калектыўнага прыёму неабмежаваным колам асобаў з дапамогай тэле- і радыёпрыёмнікаў.

23. Тэлевізійны сродак масавай інфармацыі — тэлепраграма, якая распаўсюджваецца з выкарыстаннем сродкаў электрасувязі не радзей за адзін раз у шэсць месяцаў.

24. Заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі — фізічная або юрыдычная асоба, у тым ліку дзяржаўны орган, якая самастойна або сумесна з іншымі фізічнымі або юрыдычнымі асобамі прыняла рашэнне аб стварэнні сродку масавай інфармацыі і звярнулася для яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

25. Фізічная асоба — грамадзянін Рэспублікі Беларусь, замежны грамадзянін, асоба без грамадзянства.

26. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, — юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе вытворчасць і выпуск сродку масавай інфармацыі на падставе рашэння заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі (далей — рашэнне аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі), або ў выпадку, калі ўказаная юрыдычная асоба не з'яўляецца заснавальнікам сродку масавай інфармацыі, — на падставе дагавора гэтай юрыдычнай асобы з заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі (далей — дагавор аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі).

**Артыкул 2. Прававая аснова дзейнасці сродку масавай інфармацыі**

1. Прававую аснову дзейнасці сродку масавай інфармацыі складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Закон, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь і іншыя акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 3. Сфера дзеяння гэтага Закона**

1. Дзеянне гэтага Закона распаўсюджваецца на сродкі масавай інфармацыі, якія засноўваюцца ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама на замежныя сродкі масавай інфармацыі ў частцы, што датычыцца іх дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Дзеянне гэтага Закона распаўсюджваецца на аналагі друкаваных, тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт, за выключэннем патрабаванняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі.

**Артыкул 4. Асноўныя прынцыпы дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі**

Асноўнымі прынцыпамі дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі з'яўляюцца:

дакладнасць інфармацыі — сродкі масавай інфармацыі павінны распаўсюджваць інфармацыю, якая адпавядае рэчаіснасці;

законнасць — інфармацыя не павінна супярэчыць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

роўнасць — сродкі масавай інфармацыі зыходзяць з роўнасці правоў усіх фізічных асобаў, дзяржаўных органаў, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў на распаўсюджанне і атрыманне масавай інфармацыі;

павага правоў і свабод чалавека — сродкі масавай інфармацыі забяспечваюць выкананне правоў і свабод чалавека, гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

разнастайнасць меркаванняў — сродкі масавай інфармацыі забяспечваюць свабоднае выказванне і распаўсюджванне розных меркаванняў і поглядаў у грамадстве;

развіццё нацыянальнай культуры — сродкі масавай інфармацыі садзейнічаюць распаўсюджванню і папулярызацыі нацыянальных культурных каштоўнасцяў;

абарона маралі — сродкі масавай інфармацыі не павінны дапускаць распаўсюджвання інфармацыі, якая разбурае нормы грамадскай маралі;

выкананне нормаў прафесійнай этыкі журналістаў і агульнапрынятых нормаў маралі — журналісты сродкаў масавай інфармацыі ў сваёй дзейнасці павінны няўхільна выконваць нормы прафесійнай этыкі і агульнапрынятыя нормы маралі.

**Артыкул 5. Свабода меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выяўленне**

У Рэспубліцы Беларусь кожнаму гарантуюцца свабода меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выяўленне.

**Артыкул 6. Недапушчальнасць манапалізацыі сродкаў масавай інфармацыі**

Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі юрыдычнымі або фізічнымі асобамі не дапускаецца.

**Артыкул 7. Недапушчальнасць незаконнага абмежавання свабоды масавай інфармацыі**

Не дапускаецца незаконнае абмежаванне свабоды масавай інфармацыі, якая выяўляецца:

у ажыццяўленні цэнзуры масавай інфармацыі — патрабаванні з боку службовых асобаў, дзяржаўных органаў, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў да юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, інфармацыйнага агенцтва, карэспандэнцкага пункта, галоўнага рэдактара (рэдактара), журналіста, заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі папярэдне ўзгадняць інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, за выключэннем выпадкаў узгаднення з аўтарам або інтэрв'юіруемым, распаўсюджвання афіцыйных інфармацыйных паведамленняў у адпаведнасці з артыкуламі 18 і 26 гэтага Закона;

ва ўмяшанні ў сферу прафесійнай самастойнасці юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі;

у прыпыненні або спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі з парушэннем патрабаванняў гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

у прымушэнні журналіста сродку масавай інфармацыі да распаўсюджвання або адмовы ад распаўсюджвання інфармацыі;

у парушэнні правоў журналіста сродку масавай інфармацыі, устаноўленых гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

у іншай перашкодзе ў якой-небудзь форме законнай дзейнасці заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі, юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, распаўсюджвальніка прадукцыі сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 8. Фінансаванне сродку масавай інфармацыі**

1. Крыніцамі фінансавання сродкаў масавай інфармацыі могуць быць сродкі заснавальніка (заснавальнікаў), сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Забараняецца атрымліваць грашовыя сродкі і іншую маёмасць у мэтах фінансавання сродкаў масавай інфармацыі ад:

2.1. замежных юрыдычных асобаў, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, што пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў удзелу ўказаных асобаў у статутным фондзе юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, а таксама іншых выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

2.2. ананімных крыніц.

**Артыкул 9. Мова сродкаў масавай інфармацыі**

1. Масавая інфармацыя можа распаўсюджвацца ў Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь і на іншых мовах.

2. У сродках масавай інфармацыі не дапускаецца выкарыстанне нецэнзурных слоў і выразаў.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ЗАСНАВАННЯ І ДЗЯРЖАЎНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ (ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ) СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Артыкул 10. Заснаванне сродкаў масавай інфармацыі**

1. Фізічная асоба, дзяржаўныя органы, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, іншыя юрыдычныя асобы, у тым ліку замежныя, засноўваюць сродкі масавай інфармацыі ў парадку і на ўмовах, вызначаных гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Замежныя юрыдычныя асобы, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, могуць засноўваць сродкі масавай інфармацыі толькі сумесна з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь.

3. Не можа выступаць у якасці заснавальніка сродку масавай інфармацыі фізічная асоба, якая:

3.1. не дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, за выключэннем выпадкаў, калі ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь няпоўнагадовы набывае дзеяздольнасць у поўным аб'ёме да дасягнення васямнаццацігадовага ўзросту;

3.2. адбывае пакаранне па прыгаворы суда або прызнаная рашэннем суда недзеяздольнай;

3.3. раней выступала ў якасці заснавальніка сродку масавай інфармацыі, выпуск якога спынены, — на працягу трох гадоў з дня ўступлення ў сілу рашэння суда аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі;

3.4. пазбаўлена ва ўстаноўленым парадку права займацца дзейнасцю, звязанай з вытворчасцю і выпускам сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 11. Дзяржаўная рэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі**

1. Сродкі масавай інфармацыі падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 3 і пунктам 7 артыкула 13 гэтага Закона.

Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

2. Замежныя сродкі масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь сваю прадукцыю са змяненнем яе формы або зместу, падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым гэтым Законам.

3. Правы і абавязкі заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі, юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, прадугледжаныя гэтым Законам, узнікаюць з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 12. Рэгістрацыйныя патрабаванні**

1. Пры дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі заснавальнікам (заснавальнікамі) або ўпаўнаважанай ім (імі) асобай падаецца заява па форме, устаноўленай рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі, з указаннем наступных звестак:

1.1. заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі;

1.2. назва і від сродку масавай інфармацыі;

1.3. мова сродку масавай інфармацыі;

1.4. юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі;

1.5. адрас юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі;

1.6. мяркуемая тэрыторыя распаўсюджвання сродку масавай інфармацыі;

1.7. спецыялізацыя (тэматыка) сродку масавай інфармацыі;

1.8. крыніцы фінансавання сродку масавай інфармацыі;

1.9. перыядычнасць сродку масавай інфармацыі;

1.10. плануемы тыраж сродку масавай інфармацыі (для друкаванага сродку масавай інфармацыі);

1.11. звесткі аб тым, ці з'яўляецца заснавальнік галоўным рэдактарам (рэдактарам) або журналістам іншых сродкаў масавай інфармацыі (для заснавальніка сродку масавай інфармацыі — фізічнай асобы), заснавальнікам іншых сродкаў масавай інфармацыі, распаўсюджвальнікам прадукцыі сродку масавай інфармацыі (для заснавальнікаў сродкаў масавай інфармацыі — фізічных і юрыдычных асобаў).

2. Да заявы, прадугледжанай пунктам 1 гэтага артыкула, прыкладаюцца:

2.1. копіі ўстаноўчых дакументаў юрыдычнай асобы, дакумента, які пацвярджае дзяржаўную рэгістрацыю юрыдычнай асобы (для заснавальніка сродку масавай інфармацыі — юрыдычнай асобы Рэспублікі Беларусь);

2.2. легалізаваная выпіска з гандлёвага рэестра краіны, дзе замежная арганізацыя заснавана, або іншы эквівалентны доказ юрыдычнага статусу замежнай юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны яе заснавання (для заснавальніка сродку масавай інфармацыі — замежнай юрыдычнай асобы);

2.3. копіі дакумента, які сведчыць асобу фізічнай асобы (для заснавальніка сродку масавай інфармацыі — фізічнай асобы);

2.4. копіі ўстаноўчых дакументаў і дакумента, які пацвярджае дзяржаўную рэгістрацыю юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі (для юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі і якая не з'яўляецца заснавальнікам сродку масавай інфармацыі);

2.5. копія рашэння аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі або дагавора аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі;

2.6. дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны за дзяржаўную рэгістрацыю сродку масавай інфармацыі.

3. Прадстаўленне копій дакументаў, прадугледжаных падпунктам 2.1 пункта 2 гэтага артыкула, не патрабуецца для дзяржаўных органаў, а таксама для іншых дзяржаўных арганізацый, прававы статус якіх вызначаны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, нарматыўнымі прававымі актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У выпадку, калі на дзяржаўны орган або іншую дзяржаўную арганізацыю, указаныя ў частцы першай гэтага пункта, ускладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, таксама не патрабуецца прадстаўленне копій дакументаў, прадугледжаных падпунктам 2.4 пункта 2 гэтага артыкула.

**Артыкул 13. Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі**

1. Рашэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі і яго ўключэння ў Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі прымаецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў месячны тэрмін з дня атрымання заявы і дакументаў, прадугледжаных артыкулам 12 гэтага Закона.

2. Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі вяртаецца заяўніку без разгляду з указаннем падставы вяртання, калі:

2.1. заява пададзеная з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых артыкулам 12 гэтага Закона;

2.2. заява ад імя заснавальніка (заснавальнікаў) пададзеная асобай, якая не мае на тое паўнамоцтваў.

3. Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў межах тэрміну, устаноўленага пунктам 1 гэтага артыкула, прымае адно з наступных рашэнняў:

3.1. аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі;

3.2. аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі.

4. Адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі і парушэнне рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ўстаноўленага для дзяржаўнай рэгістрацыі тэрміну могуць быць абскарджаны заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі ў судовым парадку.

5. Сродак масавай інфармацыі лічыцца зарэгістраваным і мае права ажыццяўляць сваю дзейнасць з дня ўключэння яго ў Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі, вядзенне якога ажыццяўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

Пасля ўключэння сродку масавай інфармацыі ў Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі яго заснавальніку (заснавальнікам) выдаецца пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі.

Форма пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі і парадак яго выдачы, а таксама пералік звестак, якія ўключаюцца ў пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устанаўліваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

6. За заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі захоўваецца права пачаць выпуск сродку масавай інфармацыі на працягу аднаго года — для тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі і шасці месяцаў — для друкаваных сродкаў масавай інфармацыі з дня ўключэння іх у Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі.

7. Не патрабуецца дзяржаўнай рэгістрацыі:

7.1. сродкаў масавай інфармацыі, спецыяльна заснаваных дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі толькі для распаўсюджвання іх афіцыйных заяў, а таксама для афіцыйнага апублікавання прававых актаў;

7.2. радыё- і тэлепраграм, якія распаўсюджваюцца па сетках, абмежаваных памяшканнямі і тэрыторыяй адной арганізацыі або маюць не больш як дзесяць абанентаў;

7.3. аўдыя- і відэапраграм, якія распаўсюджваюцца ў запісе тыражом не больш як дзесяць экзэмпляраў;

7.4. друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, што выходзяць у свет тыражом, які не перавышае 299 экзэмпляраў.

**Артыкул 14. Перарэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі**

1. Перарэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 11—13 гэтага Закона. Заява аб перарэгістрацыі сродку масавай інфармацыі падаецца ў месячны тэрмін з моманту ўзнікнення падстаў для перарэгістрацыі, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула.

2. Перарэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі з'яўляецца абавязковай:

2.1. пры рэарганізацыі (ліквідацыі) юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца адным з заснавальнікаў сродку масавай інфармацыі;

2.2. пры змене складу заснавальнікаў сродку масавай інфармацыі;

2.3. пры змяненні звестак, прадугледжаных падпунктамі 1.2 і 1.4 пункта 1 артыкула 12 гэтага Закона.

3. Пры змяненні іншых звестак, якія падлягаюць уключэнню ў Дзяржаўны рэестр сродкаў масавай інфармацыі, заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі ў месячны тэрмін з дня іх змянення пісьмова паведамляе аб гэтым рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі з прыкладаннем дакументаў, што пацвярджаюць адпаведныя змяненні.

**Артыкул 15. Падставы для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі**

1. Падставамі для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі з'яўляюцца:

1.1. невыкананне патрабаванняў, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 артыкула 10 гэтага Закона;

1.2. неадпаведнасць рэчаіснасці звестак, указаных у заяве аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі;

1.3. неадпаведнасць назвы, спецыялізацыі (тэматыкі) сродку масавай інфармацыі патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 38 гэтага Закона;

1.4. наяўнасць у Дзяржаўным рэестры сродкаў масавай інфармацыі сродку масавай інфармацыі з такой жа назвай;

1.5. ускладанне функцый рэдакцыі сродку масавай інфармацыі на юрыдычную асобу (камерцыйную арганізацыю), у статутным фондзе якой доля замежных інвестыцый складае 30 і больш працэнтаў;

1.6. ускладанне функцый рэдакцыі сродку масавай інфармацыі на юрыдычную асобу (некамерцыйную арганізацыю), 30 і больш працэнтаў заснавальнікаў (удзельнікаў, членаў) якой складаюць замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і (або) асобы без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Паведамленне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі накіроўваецца заяўніку ў пісьмовай форме ў дзесяцідзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння з указаннем падстаў для адмовы, але не пазней як праз месяц з дня атрымання дакументаў, прадугледжаных артыкулам 12 гэтага Закона.

**Артыкул 16. Прызнанне дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі несапраўднай. Ануляванне пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі**

1. Дзяржаўная рэгістрацыя сродку масавай інфармацыі можа быць прызнана рашэннем суда несапраўднай у выпадку, калі яна праведзена з парушэннем патрабаванняў гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі анулюе пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі, калі:

2.1. сродак масавай інфармацыі не прайшоў перарэгістрацыю;

2.2. заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі прапушчаны тэрміны, прадугледжаныя пунктам 6 артыкула 13 гэтага Закона;

2.3. выпуск сродку масавай інфармацыі спынены па рашэнні суда ў парадку, прадугледжаным артыкулам 51 гэтага Закона, альбо заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі ў адпаведнасці з падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 29 гэтага Закона;

2.4. ліквідавана юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо якая з'яўляецца адзіным заснавальнікам сродку масавай інфармацыі;

2.5. памерла (аб'яўлена памерлай) фізічная асоба, якая з'яўляецца адзіным заснавальнікам сродку масавай інфармацыі, калі спадчыннікі не заявілі аб прыняцці правоў і абавязкаў заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі;

2.6. ва ўстаноўчыя дакументы юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, унесены змяненні, якія прадугледжваюць выключэнне відаў дзейнасці, звязаных з вытворчасцю і выпускам сродку масавай інфармацыі (у выпадку, калі такія віды дзейнасці ўказваліся ва ўстаноўчых дакументах);

2.7. прызнана страціўшым сілу, несапраўдным або адменена рашэнне аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо спыніў дзеянне дагавор аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі і не прадстаўлены ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі дакументы, якія пацвярджаюць ускладанне функцый рэдакцыі сродку масавай інфармацыі на іншую юрыдычную асобу.

3. У выпадку прызнання дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі несапраўднай або анулявання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі па падставах, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, сродак масавай інфармацыі падлягае выключэнню з Дзяржаўнага рэестра сродкаў масавай інфармацыі.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ПРАДУКЦЫІ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Артыкул 17. Парадак распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі**

1. Распаўсюджванне прадукцыі сродку масавай інфармацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь юрыдычнай асобай, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо на падставе дагавора, заключанага ёй ва ўстаноўленым парадку з распаўсюджвальнікам прадукцыі сродку масавай інфармацыі.

2. Калі сродак масавай інфармацыі распаўсюджвае інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, што раней распаўсюджваліся іншым сродкам масавай інфармацыі, то пры гэтым павінна быць зроблена спасылка на сродак масавай інфармацыі, які раней распаўсюдзіў гэтыя інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы.

3. Інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, якія распаўсюджваюцца інфармацыйным агенцтвам, павінны суправаджацца спасылкай на гэта інфармацыйнае агенцтва.

4. Парадак распаўсюджвання прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. Прадукцыя замежнага сродку масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змянення формы і зместу, можа быць распаўсюджана ў Рэспубліцы Беларусь пасля атрымання замежным сродкам масавай інфармацыі адпаведнага дазволу ў рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

Парадак выдачы дазволу на распаўсюджванне прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі, прадугледжанай часткай першай гэтага пункта, устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 18. Распаўсюджванне афіцыйных інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў**

1. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, абавязана распаўсюдзіць бясплатна і ў пэўны тэрмін:

1.1. Рашэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу і ў якім змяшчаецца патрабаванне аб паведамленні для ўсеагульнага ведама такога рашэння праз гэты сродак масавай інфармацыі;

1.2. Інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, якія паступілі з дзяржаўных органаў і датычацца дзейнасці юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі гэтага сродку масавай інфармацыі.

2. Заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі маюць права абавязаць юрыдычную асобу, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, змясціць у сродку масавай інфармацыі бясплатна і ў вызначаны ім (імі) тэрмін афіцыйнае інфармацыйнае паведамленне і (або) матэрыял ад яго (іх) імя (заяву заснавальніка (заснавальнікаў)). Максімальны аб'ём заявы заснавальніка (заснавальнікаў) вызначаецца ў рашэнні аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо дагаворы аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 19. Захоўванне інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў**

1. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, абавязана захоўваць арыгіналы распаўсюджаных ёю інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў на працягу аднаго года пасля іх распаўсюджвання.

2. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі тэлевізійнага або радыёвяшчальнага сродку масавай інфармацыі, абавязана захоўваць у запісе не менш як адзін год з дня выпуску інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы ўласных радыё-, тэлеперадач.

**Артыкул 20. Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы**

Размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы ў сродках масавай інфармацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб рэкламе.

**Артыкул 21. Выраб і распаўсюджванне прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі эратычнага характару**

1. Парадак вырабу і распаўсюджвання прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі эратычнага характару, а таксама парадак аднясення прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі да прадукцыі эратычнага характару вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Рознічны продаж прадукцыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі эратычнага характару дапускаецца толькі ў запячатаных непразрыстых упакоўках у спецыяльна прызначаных для гэтага месцах і памяшканнях, якія вызначаюцца для гэтых мэтаў мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

3. Распаўсюджванне радыё- і тэлепраграм эратычнага характару без спецыяльнага кадзіравання сігналу не дапускаецца.

## ГЛАВА 4
## АСАБЛІВАСЦІ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ДРУКАВАНЫХ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Артыкул 22. Выходныя звесткі друкаванага сродку масавай інфармацыі**

У кожным выпуску друкаванага сродку масавай інфармацыі павінны быць указаны:

назва друкаванага сродку масавай інфармацыі;

заснавальнік (заснавальнікі) друкаванага сродку масавай інфармацыі;

прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку (калі маецца) галоўнага рэдактара (рэдактара) друкаванага сродку масавай інфармацыі;

парадкавы нумар друкаванага сродку масавай інфармацыі і дата яго выпуску, а для газет — таксама час падпісання ў друк;

цана;

тыраж;

штрыхавы ідэнтыфікацыйны код;

падпісны індэкс (для друкаванага сродку масавай інфармацыі, які распаўсюджваецца па падпісцы);

адрас юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі друкаванага сродку масавай інфармацыі;

адрас друкарні;

нумар пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі (для друкаванага сродку масавай інфармацыі, які падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі);

рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі, які зарэгістраваў дадзены друкаваны сродак масавай інфармацыі (для друкаванага сродку масавай інфармацыі, які падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі).

**Артыкул 23. Абавязковыя бясплатныя зкзэмпляры друкаваных сродкаў масавай інфармацыі**

1. Абавязковыя бясплатныя экзэмпляры друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку вызваленых ад дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з падпунктамі 7.1 і 7.4 пункта 7 артыкула 13 гэтага Закона, адразу пасля выдання рассылаюцца заснавальніку (заснавальнікам) друкаванага сродку масавай інфармацыі, рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі, ва ўстанову «Нацыянальная кніжная палата Беларусі», дзяржаўныя ўстановы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», «Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь», «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», іншыя арганізацыі згодна з пералікам, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак рассылкі абавязковых бясплатных зкзэмпляраў друкаваных сродкаў масавай інфармацыі вызначаецца палажэннем аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 5
## АСАБЛІВАСЦІ ДЗЕЙНАСЦІ ТЭЛЕВІЗІЙНЫХ І РАДЫЁВЯШЧАЛЬНЫХ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Артыкул 24. Парадак ажыццяўлення тэлевізійнага вяшчання і радыёвяшчання**

1. Тэлевізійнае вяшчанне і радыёвяшчанне ажыццяўляюцца праз выкарыстанне ўласных або арандаваных сродкаў электрасувязі.

2. Правілы ўвозу, набыцця і эксплуатацыі сродкаў электрасувязі, у тым ліку спадарожнікавых, якія прымяняюцца тэлевізійнымі і радыёвяшчальнымі сродкамі масавай інфармацыі, устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 25. Выходныя звесткі тэлевізійнага і радыёвяшчальнага сродку масавай інфармацыі**

1. У кожным выпуску радыё-, тэлепраграмы павінна аб'яўляцца (указвацца) назва праграмы.

2. Пры бесперапынным вяшчанні сродку масавай інфармацыі назва радыё-, тэлепраграмы павінна аб'яўляцца (указвацца) не радзей як чатыры разы ў суткі.

**Артыкул 26. Афіцыйныя інфармацыйныя паведамленні**

1. Дзяржаўныя тэлевізійныя і радыёвяшчальныя сродкі масавай інфармацыі забяспечваюць распаўсюджванне ў радыё-, тэлеперадачах заяў і зваротаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іншых асобаў, якія займаюць найвышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, а таксама інфармацыі аб іншых грамадска значных фактах, аб дзейнасці дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый.

2. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права без папярэдняга ўзгаднення з дзяржаўнымі тэлевізійнымі і радыёвяшчальнымі сродкамі масавай інфармацыі звяртацца да народа Рэспублікі Беларусь па важных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця.

## ГЛАВА 6
## ПРАВАВЫ СТАТУС СУБ'ЕКТАЎ ПРАВААДНОСІНАЎ У СФЕРЫ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**Артыкул 27. Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі**

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, якое ў межах сваёй кампетэнцыі праводзіць дзяржаўную палітыку, ажыццяўляе рэгуляванне, кіраванне і каардынацыю дзейнасці іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі, ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю сродкаў масавай інфармацыі і выконвае іншыя функцыі, вызначаныя гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 28. Грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі**

1. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ствараецца грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі, які складаецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі, іншых арганізацый і іншых асобаў.

2. Склад грамадскага каардынацыйнага савета ў сферы масавай інфармацыі і палажэнне аб ім зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

3. Рашэнні грамадскага каардынацыйнага савета ў сферы масавай інфармацыі носяць рэкамендацыйны характар.

**Артыкул 29. Статус заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі**

1. Заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі маюць права:

1.1. выступаць у якасці юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі (калі заснавальнікам сродку масавай інфармацыі з'яўляецца юрыдычная асоба), распаўсюджвальніка прадукцыі сродку масавай інфармацыі;

1.2. перадаваць свае правы і абавязкі трэцяй асобе на падставе дагавора ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

1.3. у выпадках, прадугледжаных у рашэнні аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо ў дагаворы аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, спыніць выпуск сродку масавай інфармацыі. Рашэнне заснавальніка (заснавальнікаў) аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі ў троxдзённы тэрмін з дня яго прыняцця накіроўваецца ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі;

1.4. ажыццяўляць іншыя правы ў адпаведнасці з гэтым Законам.

2. Заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі не мае права ўмешвацца ў дзейнасць сродку масавай інфармацыі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам, рашэннем аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо дагаворам аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі.

3. Заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі нясе адказнасць за выкананне патрабаванняў, заяўленых ім пры заснаванні і дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі, устаноўленых гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама за змест інфармацыі, якая распаўсюджваецца заснаваным ім сродкам масавай інфармацыі.

4. Правы і абавязкі заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі могуць пераходзіць у спадчыну да яго спадчыннікаў у выпадку, калі заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі з'яўляецца фізічная асоба (фізічныя асобы).

**Артыкул 30. Статус юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі**

Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, ажыццяўляе вытворчасць і выпуск сродку масавай інфармацыі на аснове гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, рашэння аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі альбо дагавора аб рэдакцыі сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 31. Статус галоўнага рэдактара (рэдактара) сродку масавай інфармацыі**

1. Галоўны рэдактар (рэдактар) сродку масавай інфармацыі ажыццяўляе сваю прафесійную дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Галоўны рэдактар (рэдактар) сродку масавай інфармацыі прымае канчатковае рашэнне ў адносінах да вытворчасці і выпуску сродку масавай інфармацыі.

3. Галоўны рэдактар (рэдактар) сродку масавай інфармацыі нясе адказнасць за выкананне патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да дзейнасці сродку масавай інфармацыі гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 32. Інфармацыйнае агенцтва**

Інфармацыйныя агенцтвы, а таксама сродкі масавай інфармацыі, якія засноўваюцца імі, рэгіструюцца ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 11—13 гэтага Закона для сродкаў масавай інфармацыі.

**Артыкул 33. Карэспандэнцкі пункт**

1. У мэтах збору, захоўвання і стварэння (падрыхтоўкі) інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, а таксама распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, можа адкрываць карэспандэнцкія пункты.

2. Парадак адкрыцця карэспандэнцкіх пунктаў устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 34. Статус журналіста сродку масавай інфармацыі**

1. У сваёй прафесійнай дзейнасці журналіст сродку масавай інфармацыі, у тым ліку замежнага, кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і нормамі прафесійнай этыкі журналістаў.

2. У сувязі з ажыццяўленнем прафесійных абавязкаў журналіст сродку масавай інфармацыі мае права:

2.1. збіраць, запытваць і атрымліваць інфармацыю з дзяржаўных органаў, ад палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў, а таксама захоўваць і распаўсюджваць інфармацыю, неабходную для ажыццяўлення яго прафесійнай дзейнасці;

2.2. прысутнічаць у парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у раёнах узброеных канфліктаў або надзвычайных сітуацый, на масавых мерапрыемствах, у месцах іншых грамадска важных падзей і перадаваць адтуль інфармацыю;

2.3. ажыццяўляць пры наяўнасці акрэдытацыі або па ўзгадненні з фізічнымі або юрыдычнымі асобамі ў адносінах да гэтых асобаў запісы, у тым ліку з выкарыстаннем сродкаў аўдыявізуальнай тэхнікі, кіна- і фотаздымак, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.4. звяртацца да спецыялістаў пры праверцы фактаў і абставінаў у сувязі з паступіўшымі інфармацыйнымі паведамленнямі і (або) матэрыяламі;

2.5. выказваць сваю асабістую думку па інфармацыйных паведамленнях і (або) матэрыялах, прызначаных для распаўсюджвання, за сваім подпісам;

2.6. распаўсюджваць падрыхтаваныя ім інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы за сваім подпісам, пад псеўданімам альбо без подпісу, агаворваць у выпадку неабходнасці захаванне тайны аўтарства.

3. Журналіст сродку масавай інфармацыі мае таксама іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Журналіст сродку масавай інфармацыі абавязаны:

4.1. паважаць правы, свабоды і законныя інтарэсы фізічных асобаў, правы і законныя інтарэсы юрыдычных асобаў;

4.2. правяраць дакладнасць атрыманых ім звестак;

4.3. прадастаўляць для распаўсюджвання дакладную інфармацыю;

4.4. указваць па жаданні асобаў, якія прадастаўляюць інфармацыю, іх аўтарства;

4.5. захоўваць канфідэнцыйнасць інфармацыі і крыніцы яе атрымання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 39 гэтага Закона;

4.6. атрымліваць згоду на распаўсюджванне ў сродку масавай інфармацыі звестак аб асабістым жыцці фізічнай асобы ад самой фізічнай асобы альбо яе законнага прадстаўніка, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

4.7. атрымліваць згоду фізічных асобаў на правядзенне аўдыя- і відэазапісу, кіна- і фотаздымак, за выключэннем іх правядзення ў месцах, адкрытых для масавага наведвання, на масавых мерапрыемствах, а таксама выпадку, прадугледжанага артыкулам 40 гэтага Закона;

4.8. адмовіцца ад дадзенага яму заснавальнікам (заснавальнікамі), галоўным рэдактарам (рэдактарам) сродку масавай інфармацыі задання, калі гэта заданне альбо яго выкананне звязаны з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

4.9. пры ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці прад'яўляць па патрабаванні службовае пасведчанне. Форма службовага пасведчання журналіста сродку масавай інфармацыі, зарэгістраванага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, устанаўліваецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

5. Журналіст сродку масавай інфармацыі выконвае таксама іншыя абавязкі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6. Журналіст замежнага сродку масавай інфармацыі мае правы і выконвае абавязкі журналіста, прадугледжаныя гэтым артыкулам, а таксама іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 35. Акрэдытацыя журналістаў сродкаў масавай інфармацыі**

1. Журналісты сродкаў масавай інфармацыі маюць права на акрэдытацыю пры дзяржаўных органах, палітычных партыях, іншых грамадскіх аб'яднаннях, іншых юрыдычных асобах для асвятлення пасяджэнняў, нарад і іншых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца імі, у парадку, устаноўленым гэтымі дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі юрыдычнымі асобамі.

2. Не дапускаецца неабгрунтаваная адмова ў акрэдытацыі журналістаў сродкаў масавай інфармацыі.

3. Акрэдытацыя журналістаў замежных сродкаў масавай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь праводзіцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Для асвятлення пасяджэнняў, нарад і іншых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі юрыдычнымі асобамі, журналісты замежных сродкаў масавай інфармацыі абавязаны таксама атрымаць акрэдытацыю ў парадку, устаноўленым пунктам 1 гэтага артыкула.

4. Ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці журналістаў замежных сродкаў масавай інфармацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без акрэдытацыі забараняецца.

## Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

**ГЛАВА 7**
**АДНОСІНЫ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ З ДЗЯРЖАЎНЫМІ ОРГАНАМІ, ІНШЫМІ ЮРЫДЫЧНЫМІ І ФІЗІЧНЫМІ АСОБАМІ**

**Артыкул 36. Права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі**

1. Фізічным асобам гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.

2. Дзяржаўныя органы, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, іншыя юрыдычныя асобы, а таксама іх службовыя асобы могуць прадстаўляць звесткі аб сваёй дзейнасці сродкам масавай інфармацыі шляхам правядзення прэс-канферэнцый, рассылкі даведачных і статыстычных матэрыялаў і іншымі спосабамі.

**Артыкул 37. Інфармацыя абмежаванага доступу**

У парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, абмяжоўваецца доступ да:

звестак, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, камерцыйную, асабістую або іншую тайну, якая ахоўваецца законам;

звестак аб сістэме арганізацыі, аб крыніцах, аб спосабах, метадах, планах і выніках аператыўна-вышуковай дзейнасці;

матэрыялаў дазнання, папярэдняга следства і судовага разбору да заканчэння вытворчасці па крымінальнай справе;

іншай інфармацыі, прадугледжанай заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 38. Інфармацыя, распаўсюджванне якой у сродках масавай інфармацыі забаронена**

1. У сродках масавай інфармацыі забаронена распаўсюджванне:

1.1. інфармацыі ад імя арганізацый, што не прайшлі ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю (перарэгістрацыю) у выпадках, калі такая рэгістрацыя (перарэгістрацыя) з'яўляецца абавязковай у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама арганізацый, у адносінах да якіх маецца ўступіўшае ў законную сілу рашэнне ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа аб іх ліквідацыі;

1.2. звестак, якія прапагандуюць выкарыстанне і ўжыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных і іншых адурманьвальных рэчываў у немедыцынскіх мэтах, а таксама звестак аб спосабах і метадах распрацоўкі, вырабу, выкарыстання і месцах набыцця наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсораў;

1.3. інфармацыі, што накіравана на прапаганду вайны, насілля, жорсткасці, экстрэмісцкай дзейнасці або змяшчае заклікі да такой дзейнасці, а таксама іншай інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. У радыё-, тэле-, відэа-, кінахранікальных праграмах забараняецца выкарыстанне схаваных уставак, якія ўздзейнічаюць на падсвядомасць людзей або аказваюць шкодны ўплыў на іх здароўе.

**Артыкул 39. Ахова крыніцы інфармацыі**

1. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, журналіст сродку масавай інфармацыі не абавязаны называць крыніцу інфармацыі і не маюць права раскрываць даныя аб фізічнай або юрыдычнай асобе, якая прадаставіла звесткі, без згоды гэтай асобы.

2. Крыніца інфармацыі і даныя аб фізічнай або юрыдычнай асобе, якая прадаставіла звесткі, называюцца па патрабаванні органа крымінальнага праследавання, суда ў сувязі з вытворчасцю папярэдняга расследавання, судовым разборам.

**Артыкул 40. Выкарыстанне скрытага аўдыя- і відэазапісу, кіна- і фотаздымак**

Распаўсюджванне ў сродках масавай інфармацыі інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, падрыхтаваных з выкарыстаннем аўдыя- і відэазапісу, кіна- і фотаздымак фізічнай асобы без яе згоды, дапускаецца толькі пры прыняцці мераў супраць магчымай ідэнтыфікацыі дадзенай асобы пабочнымі асобамі, а таксама пры ўмове, што распаўсюджванне гэтых інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў не парушае канстытуцыйных правоў і свабод асобы і неабходна для абароны грамадскіх інтарэсаў, за выключэннем выпадкаў распаўсюджвання такіх інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў па патрабаванні органа крымінальнага праследавання, суда ў сувязі з вытворчасцю папярэдняга расследавання, судовым разборам.

**Артыкул 41. Выкарыстанне аўтарскіх твораў і пісьмаў**

1. Пры выкарыстанні ў сродках масавай інфармацыі аўтарскіх твораў і пісьмаў аўтарскія і сумежныя правы ў адносінах да такіх твораў і пісьмаў захоўваюцца за іх аўтарамі альбо іншымі праваўладальнікамі. Аўтар альбо іншы праваўладальнік могуць вызначыць умовы і характар выкарыстання прадастаўленых рэдакцыі сродку масавай інфармацыі твора або пісьма.

2. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, на сваё меркаванне адбірае і распаўсюджвае ў сродку масавай інфармацыі адрасаваныя ёй пісьмы. Пры распаўсюджванні ў сродках масавай інфармацыі пісьмаў дапускаюцца рэдагаванне і скарачэнне іх тэксту пры ўмове, што гэта не скажае сэнсу пісьмаў. У выпадку неабходнасці юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, перасылае пісьмы тым дзяржаўным органам, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, іншым юрыдычным асобам і іх службовым асобам, да кампетэнцыі якіх адносіцца іх разгляд.

3. Ніхто не мае права абавязаць юрыдычную асобу, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, распаўсюджваць адхіленыя ёю інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, калі іншае не прадугледжана гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 42. Права на абвяржэнне (адказ)**

1. Фізічныя асобы маюць права патрабаваць ад юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, абвяржэння распаўсюджаных звестак, калі гэтыя звесткі не адпавядаюць рэчаіснасці і зневажаюць іх гонар, годнасць або дзелавую рэпутацыю.

Юрыдычныя асобы, у тым ліку замежныя, маюць права патрабаваць ад юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, абвяржэння распаўсюджаных звестак, калі гэтыя звесткі не адпавядаюць рэчаіснасці і зневажаюць іх дзелавую рэпутацыю.

2. Калі юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, не мае доказаў таго, што распаўсюджаныя ёю звесткі адпавядаюць рэчаіснасці, яна абавязана распаўсюдзіць абвяржэнне (папраўку або ўдакладненне).

3. Фізічныя асобы, дзяржаўныя органы, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, іншыя юрыдычныя асобы, у адносінах да якіх у сродку масавай інфармацыі распаўсюджаны звесткі, што ўшчамляюць іх правы або інтарэсы, якія ахоўваюцца законам, маюць права на распаўсюджванне свайго адказу ў тым жа сродку масавай інфармацыі.

4. Абвяржэнне распаўсюджаных у сродку масавай інфармацыі звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, не пазбаўляе фізічных і юрыдычных асобаў права на зварот у судовым парадку для абароны іх гонару, годнасці або дзелавой рэпутацыі.

**Артыкул 43. Парадак распаўсюджвання абвяржэння (адказу)**

1. У абвяржэнні (адказе) павінна быць указана, якія звесткі не адпавядаюць рэчаіснасці, калі і як яны былі распаўсюджаны сродкам масавай інфармацыі.

2. Друкаваны сродак масавай інфармацыі абавязаны распаўсюдзіць абвяржэнне (адказ) у спецыяльнай рубрыцы альбо на тым жа месцы паласы і тым жа шрыфтам, што інфармацыйныя паведамленне і (або) матэрыял, якія абвяргаюцца.

3. У тэлевізійных або радыёвяшчальных сродках масавай інфармацыі абвяржэнне (адказ) павінна быць перададзена ў той жа час сутак і ў той жа перадачы або ў перадачы падобнай тэматыкі, што і інфармацыйныя паведамленне і (або) матэрыял, якія абвяргаюцца.

4. Абвяржэнне (адказ) павінна быць распаўсюджана:

4.1. у сродках масавай інфармацыі, выпуск якіх ажыццяўляецца не радзей як адзін раз у тыдзень, — не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення патрабавання аб абвяржэнні (адказе) або яго тэксту;

4.2. у іншых сродках масавай інфармацыі — пры чарговым выпуску.

**Артыкул 44. Падставы для адмовы ў распаўсюджванні абвяржэння (адказу)**

1. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, мае права адмовіць у распаўсюджванні абвяржэння звестак, указаных у пункце 1 артыкула 42 гэтага Закона, калі абвяргаюцца звесткі, раней абвергнутыя ў дадзеным сродку масавай інфармацыі.

2. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, не вызваляецца ад абавязку па абвяржэнні звестак, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 артыкула 52 гэтага Закона.

3. Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, мае права адмовіць у распаўсюджванні адказу, калі дадзенае патрабаванне:

3.1. змяшчае інфармацыю, распаўсюджванне якой абмежавана або забаронена ў адпаведнасці з артыкуламі 37 і 38 гэтага Закона;

3.2. супярэчыць рашэнню суда, якое ўступіла ў законную сілу;

3.3. з'яўляецца ананімным.

4. Адмова ў распаўсюджванні абвяржэння (адказу) у пяцідзённы тэрмін накіроўваецца зацікаўленым асобам у пісьмовай форме з указаннем прычын адмовы.

5. Адмова ў распаўсюджванні абвяржэння (адказу) альбо парушэнне парадку распаўсюджвання абвяржэння (адказу) могуць быць абскарджаны ў судовым парадку.

**ГЛАВА 8**
**МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

**Артыкул 45. Міжнароднае супрацоўніцтва сродкаў масавай інфармацыі**

Сродкі масавай інфармацыі ўдзельнічаюць у міжнародным супрацоўніцтве на аснове міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Карэспандэнцкія пункты замежных сродкаў масавай інфармацыі**

1. У Рэспубліцы Беларусь могуць адкрывацца карэспандэнцкія пункты замежных сродкаў масавай інфармацыі.

2. Парадак адкрыцця карэспандэнцкіх пунктаў замежных сродкаў масавай інфармацыі ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 47. Карэспандэнцкія пункты сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах**

1. Сродкі масавай інфармацыі, зарэгістраваныя ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права адкрываць карэспандэнцкія пункты ў замежных дзяржавах у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў з абавязковым пісьмовым паведамленнем рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

2. Паведамленне аб адкрыцці карэспандэнцкага пункта ў замежнай дзяржаве накіроўваецца ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў месячны тэрмін з дня адкрыцця карэспандэнцкага пункта.

**ГЛАВА 9**
**АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ**

**Артыкул 48. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі**

Парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі цягне крымінальную, адміністрацыйную, грамадзянска-прававую і іншую адказнасць у адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 49. Пісьмовае папярэджанне**

1. Пісьмовае папярэджанне выносіцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, у выпадку:

1.1. ажыццяўлення дзеянняў, якія супярэчаць патрабаванням гэтага Закона, у тым ліку давядзення да ўсеагульнага ведама інфармацыі, распаўсюджванне якой абмежавана або забаронена ў адпаведнасці з артыкуламі 37 і 38 гэтага Закона;

1.2. распаўсюджвання недакладнай інфармацыі, якая можа нанесці шкоду дзяржаўным або грамадскім інтарэсам;

1.3. вытворчасці і (або) распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі без дазволу галоўнага рэдактара (рэдактара) сродку масавай інфармацыі;

1.4. распаўсюджвання звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці і зневажаюць гонар, годнасць або дзелавую рэпутацыю фізічных асобаў альбо дзелавую рэпутацыю юрыдычных асобаў.

2. Пісьмовае папярэджанне выносіцца заснавальніку (заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі ў выпадку парушэння патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 29 гэтага Закона.

3. Пісьмовае папярэджанне не пазней чым у трохдзённы тэрмін пасля яго вынясення выдаецца альбо накіроўваецца па пошце юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальніку (заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі з указаннем дапушчаных парушэнняў і тэрміну іх устаранення.

Юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі абавязаны пісьмова паведаміць у рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі аб устараненні парушэнняў, якія сталі падставай для вынясення пісьмовага папярэджання, і прадставіць пацвярджальныя дакументы не пазней чым у трохдзённы тэрмін пасля заканчэння тэрміну ўстаранення парушэнняў, устаноўленага ў пісьмовым папярэджанні.

4. Рашэнне аб вынясенні пісьмовага папярэджання можа быць у месячны тэрмін абскарджана юрыдычнай асобай, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі ў судовым парадку.

**Артыкул 50. Прыпыненне выпуску сродку масавай інфармацыі**

1. Выпуск сродку масавай інфармацыі можа быць прыпынены на тэрмін да трох месяцаў рашэннем рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў выпадках, калі:

1.1. юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальніку (заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі было вынесена пісьмовае папярэджанне і гэтыя юрыдычная асоба або заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі ў тэрміны, прадугледжаныя пунктам 3 артыкула 49 гэтага Закона, не ўстаранілі парушэнні, што сталі падставай для вынясення пісьмовага папярэджання, альбо не паведамілі ў рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі аб іх устараненні з прадстаўленнем пацвярджальных дакументаў;

1.2. рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі прад'явіў у суд іск аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі.

2. Рашэнне аб прыпыненні выпуску сродку масавай інфармацыі можа быць прынята не пазней чым у трохмесячны тэрмін з дня ўзнікнення падстаў, прадугледжаных пунктам 1 гэтага артыкула.

3. Рашэнне аб прыпыненні выпуску сродку масавай інфармацыі можа быць абскарджана ў месячны тэрмін у судовым парадку юрыдычнай асобай, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальнікам (заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі.

**Артыкул 51. Спыненне выпуску сродку масавай інфармацыі**

1. Выпуск сродку масавай інфармацыі можа быць спынены рашэннем суда па іску рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі альбо пракурора.

2. Рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі можа прад'явіць у суд іск аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі ў выпадку:

2.1. аднаразовага парушэння палажэнняў гэтага Закона, якія ўстанаўліваюць парадак распаўсюджвання прадукцыі замежнымі сродкамі масавай інфармацыі, афіцыйных інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, прадукцыі эратычнага характару, а таксама парадак ажыццяўлення тэлевізійнага вяшчання і радыёвяшчання;

2.2. вынясення юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальніку (заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі на працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў;

2.3. атрымання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь шляхам унясення заведама лжывых звестак у дакументы, прадстаўленыя для дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі.

3. Рашэнне аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі можа быць прынята не пазней чым у трохмесячны тэрмін з дня ўзнікнення падстаў, прадугледжаных падпунктамі 2.1 і 2.2 пункта 2 гэтага артыкула.

4. Пракурор можа прад'явіць у суд іск аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі ў выпадку, калі службовым асобам юрыдычнай асобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, альбо заснавальніку (заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі на працягу года было вынесена два і больш афіцыйныя папярэджанні пракурора аб недапушчальнасці паўторнага ўчынення правапарушэнняў, якія цягнуць за сабой адказнасць, устаноўленую гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі, альбо падрыхтоўкі да ўчынення імі супрацьпраўных дзеянняў.

**Артыкул 52. Абставіны, якія выключаюць адказнасць**

1. Журналіст, заснавальнік (заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі, галоўны рэдактар (рэдактар) сродку масавай інфармацыі, юрыдычная асоба, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі, распаўсюджвальнік прадукцыі сродку масавай інфармацыі, інфармацыйнае агенцтва, карэспандэнцкі пункт не нясуць адказнасці за распаўсюджванне звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, калі гэтыя звесткі:

1.1. атрыманыя ад дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый, іх службовых асобаў, а таксама змяшчаюцца ў афіцыйных інфармацыйных паведамленнях і (або) матэрыялах;

1.2. атрыманыя ад інфармацыйных агенцтваў пры ўмове наяўнасці спасылак на дадзеныя інфармацыйныя агенцтвы;

1.3. атрыманыя ад палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асобаў, а таксама змяшчаюцца ў афіцыйных інфармацыйных паведамленнях і (або) матэрыялах прэс-службаў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў і іншых юрыдычных асобаў;

1.4. з'яўляюцца даслоўным узнаўленнем афіцыйных выступленняў службовых асобаў дзяржаўных органаў;

1.5. змяшчаюцца ў інфармацыйных паведамленнях і (або) матэрыялах тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі, якія выходзяць у эфір без папярэдняга запісу.

2. Суб'екты прававаадносінаў у сферы масавай інфармацыі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, перад распаўсюджваннем звестак, якія могуць дыскрэдытаваць Рэспубліку Беларусь, а таксама зневажаць гонар, годнасць або дзелавую рэпутацыю фізічных асобаў альбо дзелавую рэпутацыю юрыдычных асобаў, атрыманых з крыніц, указаных у падпункце 1.3 пункта 1 гэтага артыкула, абавязаны праверыць дакладнасць указаных звестак і прадаставіць магчымасць распаўсюджвання адначасовага каментарыя фізічных і (або) юрыдычных асобаў, у тым ліку дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый (іх прэс-службаў), у адносінах да якіх могуць быць распаўсюджаны дадзеныя звесткі альбо ў кампетэнцыю якіх уваходзіць падрыхтоўка растлумачэнняў у адносінах да інфармацыі, што распаўсюджваецца.

У выпадку невыканання патрабаванняў, прадугледжаных часткай першай гэтага пункта, суб'екты прававаадносінаў у сферы масавай інфармацыі, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, не вызваляюцца ад адказнасці за распаўсюджванне звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці.

3. За суб'ектамі прававаадносінаў у сферы масавай інфармацыі, указанымі ў пункце 1 гэтага артыкула, захоўваецца права не распаўсюджваць звесткі, указаныя ў пункце 2 гэтага артыкула.

**ГЛАВА 10**
**ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 53. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых законаў Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў**

Прызнаць, што страцілі сілу:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 студзеня 1995 года «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 12, ст. 121).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 1996 года «Аб унясенні дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 21, ст. 378).

3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 1998 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» і Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 5, ст. 27).

4. Артыкул 4 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года «Аб унясенні дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 54, 2/56).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 1999 года «Аб унясенні дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 2, 2/112).

6. Артыкул 12 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях ліцэнзавання асобных відаў дзейнасці і прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235).

7. Пункт 2 артыкула 32 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 года «Аб рэкламе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1321).

8. Пункт 12 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 147, 2/1336).

9. Артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях выплаты дзяржаўнай пошліны» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398).

10. Артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 2 мая 2008 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абавязковага бясплатнага экзэмпляра дакументаў і бібліятэчнай справы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 119, 2/1434).

**Артыкул 54. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона**

1. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у пяцімесячны тэрмін:

1.1. падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку прапановы па прывядзенні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

1.2. прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

2. Сродкам масавай інфармацыі на працягу аднаго года прайсці перарэгістрацыю ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі гэтым Законам.

Пры гэтым падставы для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, прадугледжаныя падпунктамі 1.5 і 1.6 пункта 1 артыкула 15 гэтага Закона, не прымяняюцца пры перарэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку на дзень прыняцця гэтага Закона.

**Артыкул 55. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і пункта 1 артыкула 54, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*17 ліпеня 2008 года, г. Мінск.*
*№ 427—3*



# ГЛУСКАЯ ЗАМАРОЗКА

Сёлета ў Глуску адкрылася новае прадпрыемства — цэх па замарозцы ягад і грыбоў раённага спажывецкага таварыства. Цяпер гэта лінія запрацавала на поўную магутнасць.

Інвестыцыйны праект рэалізаваны ў межах Дзяржаўнай праграмы па развіцці малых гарадоў: на новую вытворчасць выдаткавана 9 мільярдаў рублёў. Паводле планаў, праект акупіцца за 8 гадоў.

Ад пачатку ягаднага сезона ў Глуску вядуць замарозку: у халадзільніках прадпрыемства ўжо захоўваюцца замарожаныя клубніцы, чарніцы і вішні. Агулам — каля 400 тон, на 2 мільярды рублёў.



Цяпер на лініі пануе яркі зялёны колер. Марозяць гарошак, які паступіў у Глуск са Слуцкага раёна. Яго спачатку мыюць і перабіраюць, потым марозяць. Дзве тоны за гадзіну — такая вытворчая магутнасць новага цэха.

Гэта першы гарошак, які марозіцца ў Глуску і будзе прадавацца ў рознічнай гандлёвай сетцы. У раённым спажывецкім таварыстве не маюць сумненняў, што попыт на яго будзе.

— Па-першае, наш гарошак будзе таннейшы за імпартны, — абяцае намеснік старшыні таварыства Юрый Вайцахоўскі. — А па-другое, прадукцыя «Глускі кошык» нічым не саступае імпартнай ні па якасці, ні па афармленні.

Тэхналогія на новым прадпрыемстве — самая сучасная. Гэта так званая шокавая замарозка, якая не разбурае структуру прадукту. Кожная ягада, грыб ці гарошына замарожваецца долі секунды і асобна, таму пры размарозцы карысны прадукт не пераўтворыцца ў кісель.

— Намі ўжо ўсе замежнікі цікавяцца, — задаволена кажа Юрый Вайцахоўскі. — Палякі, літоўцы, немцы. Таму што якасць! Са збытам прадукцыі, якая замарожана ў Глуску, праблем сёння няма.

Актыўна заключаюцца дагаворы, і на гэтым тыдні па першым кантракце будзе адгружана 60 тон чарніц.

— Глускі раён — гэта лясная зона, і ў нас шмат ягад і грыбоў, — гаворыць намеснік старшыні Глускага райвыканкама Рыгор Бяляцкі. — Іх перапрацоўка паўстала на парадку дня яшчэ з пачатку 1990-х гадоў, калі з'явіўся попыт на дары лясоў. Аднак на той час найбольшы прыбытак ад загатоўкі чарніц і грыбоў мелі прыватнікі.

Раней лясныя дары ішлі за мяжу незамарожаныя альбо замарожаныя ў звычайных халадзільных камерах, калі гублялася якасць. Летась чысты прыбытак Глускага спажывецкага таварыства ад нарыхтовак склаў 200 мільёнаў рублёў. Сёлета, калі запрацаваў цэх замарозкі, кіраўніцтва разлічвае зарабіць болей за мінулыя гады. А раённыя ўлады, адпаведна, плануюць атрымаць большыя падаткі ў бюджэт.

Цяпер Глускае спажывецкае таварыства можа прыняць значна большыя аб'ёмы ягад і грыбоў. Мясцовае насельніцтва актывізавалася ў сэнсе збірання — гэтым займаецца ледзь не кожная сям'я на Глушчыне. Занятак прыносіць неблагія грошы: кілаграм чарніц у Глускім раёне прымаюць ад 4,5 да 5,5 тысячы рублёў.

Аднак каштоўных чарніц, якія потым ідуць на экспарт у Германію ды Польшчу, сёлета не такі вялікі ўраджай, як быў летась. Затое ёсць вялікія надзеі на грыбы. Кароткачасовыя дажджы і цёплае надвор'е павінны даць грыбны набытак. Першыя лісічкі ўжо замарожаныя, і атрымліваюцца, як кажуць у цэху, «вельмі прыгожыя».

Гарошак — гэта першая спроба ў Глуску замарозіць гародніну. Гарошыны падобныя на ягады. А каб справіцца з бульбай, морквай ды буракамі, увосень у цэху па замарозцы мяркуюць усталяваць яшчэ адну тэхналагічную лінію — па апрацоўцы і замарозцы ўсёй гародніны. Тады можна будзе рабіць для продажу гатовыя сумесі — для супоў і гарніраў.

— Так, мы ўжо рыхтуем дакументацыю на рэцэптуру, — пацвердзіла начальнік цэха па замарозцы Ірына Супрунчык. — Наш час такі: хуткія харчы патрэбны сучасным гаспадыням. Закінуў з пакета ў каструлю, 10 хвілін — і страва гатова. Падобныя польскія сумесі карыстаюцца папулярнасцю. А нашы, паверце, не горшыя. Абсталяванне сучаснае, і вітаміны пры размарозцы захоўваюцца на 80 %.

— Мы поўнасцю можам забяспечыць замарожанымі ягадамі і грыбамі сваю гандлёвую сетку, — запэўніваюць у Глускім спажыўтаварыстве. — Днямі на замарозку паступіць алыча з Драгічынскага раёна і нават чарнасліў з Сербіі. Пакуль яшчэ прадукцыя не пайшла на паліцы крам. Ну хто будзе браць зараз замарожаныя клубніцы ці вішні, калі ўсё гэта альбо ёсць на агародзе, альбо толькі ад'еліся? Дацягнем да халадоў — восенню наша прадукцыя будзе цалкам дарэчы. Да таго ж мяркуем накіроўваць яе і ў суседнюю Расію.

У часе нядаўняга візіту ў Гомельскую вобласць Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць больш актыўна развіваць у краіне перапрацоўку гародніны.

Перад мясцовымі ўладамі ставіцца задача: набыць у насельніцтва дары лясоў і лішкі ўраджаю з падсобных участкаў, перапрацаваць і прадаць. Размова ідзе не толькі пра грыбы і ягады, але і пра тыя ж агуркі ды яблыкі, іншую садавіну і гародніну.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура лічыць, што рэзервы ёсць, а таму трэба забяспечыць перапрацоўку набытага ў людзей. Акрамя Глускага цэха па замарозцы, ідзе рэканструкцыя Быхаўскага кансервава-гароднінасушыльнага завода, пачаліся работы на падобным прадпрыемстве ў Кіраўску. Хутка запрацуе прадпрыемства «Слаўгарадскі харчавік», дзе будуць сушыць гародніну па сучаснай тэхналогіі.

— Але гэтага мала, — упэўнены Барыс Батура. — Аб'ёмы перапрацоўкі не адпавядаюць патрабаванням і тым магчымасцям, якія сёння ёсць у Магілёўскай вобласці. Таму нам абавязкова трэба, не адкладаючы на далёкую перспектыву, у 2009—2010 гадах пабудаваць яшчэ 2-3 прадпрыемствы, падобныя да Глускага цэха па замарозцы, і столькі ж гароднінa-сушыльных заводаў. Яны не самыя дарагія, іх можна даволі хутка ўзвесці.

Магілёўскія ўлады лічаць, што такія планы дазволяць вырашыць адразу некалькі праблем. Па-першае, імпартазамяшчэнне: навошта набываць польскія ці галандскія замарожаныя клубніцы, калі ў нас ёсць свае? Па-другое, экспарт: замарожаныя чарніцы, вельмі карысныя для здароўя ягады, ахвотна набываюць замежнікі. Наступнае, вядома, занятасць людзей — на прадпрыемствах адкрываюцца новыя працоўныя месцы. І, нарэшце, новыя паступленні ў бюджэт, за якія вырашаюцца важныя сацыяльныя праблемы грамадства.

**Ілона ІВАНОВА,**
*Глускі раён — Магілёў.*

## ЦІ ТРЭБА РАБІЦЬ ВЕЧНЫ ЗМРОК У САЛОНЕ АЎТО?

**Як паведамляла «Звязда», з 4 па 14 жніўня сталічная Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць комплекс мерапрыемстваў па выкараненні ўдзелу ў дарожным руху транспартных сродкаў з таніраваным шклом.**

У сталіцы за ўчыненне адзначаных правапарушэнняў да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 571 вадзіцель. Зафіксаваны і такія выпадкі, калі ўладальнікі транспартных сродкаў з таніраваным шклом пры рэгістрацыі і праходжанні дзяржаўнага тэхнічнага агляду транспарту ажыццяўляюць яго замену, пасля чаго, насуперак закону, прадаўжаюць эксплуатацыю транспартных сродкаў з таніраваным шклом.

**ДАВЕДКА**

Нягледзячы на такія перавагі таніраванага шкла, як паглынанне ўльтрафіялетавых прамянёў, павышанае адчуванне бяспекі, трываласць пры ўдары ці траплянні каменя, яно мае і значныя недахопы. Часам тая ж самая трываласць можа выйсці бокам: тэрмінова пакінуць аўтамабіль пры заклінаваных дзвярах (напрыклад, пры падзенні аўтамабіля ў раку дзверы ад удару аб ваду могуць заблакіравацца) будзе значна складаней, калі шкло нельга хутка выбіць.

Акрамя таго, не ўсе, нават вопытныя вадзіцелі, ведаюць аб тым, што таніраванае шкло негатыўна ўздзейнічае на здароўе. У цёмны час сутак у чалавечым арганізме выпрацоўваецца «гармон сну» — мелатанін, дзякуючы якому чалавек можа спаць моцным сном. Выпрацоўка мелатаніну залежыць ад асветленасці — лішак святла зніжае ўтварэнне гармону, а зніжэнне асветленасці, у сваю чару, павышае сінтэз і сакрэцыю мелатаніну. Адпаведна, чым цямнейшае памяшканне, тым больш мелатаніну выпрацоўваецца — павышаецца млявасць і санлівасць, што недапушчальна пры яздзе за рулём.

У дадатак да гэтага, у інтэнсіўным гарадскім патоку жэсты рук вадзіцеля таніраванага аўтамабіля становяцца менш прыкметнымі (напрыклад, калі ён хоча прапусціць іншы аўтамабіль ці папрасіць «суседа» па патоку прапусціць яго).

## ЯК «ПРАВЕРКА» АБЯРНУЛАСЯ «ВЫСЫЛКАЙ»

За мінулыя выхадныя толькі на тэрыторыі Савецкага раёна сталіцы за кіраванне транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнага ап'янення работнікі ДАІ затрымалі 6 вадзіцеляў. Сярод іх і 18-гадовы грамадзянін Узбекістана, які прыехаў у Беларусь да родных у госці. Хлопец адразу ж прызнаўся, што выпіў літр піва. А пасля вырашыў пакатацца на скутары, які стаяў ля дома, каб праверыць, ці не сапсаваўся ён ад дажджу. У любым выпадку аб затрыманні замежных грамадзян на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь за ўчыненне дадзеных правапарушэнняў неадкладна паведамляецца ў тэрытарыяльны аддзел грамадзянства і міграцыі, — **паведамілі ў ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска,** — дзе ў адпаведнасці з заканадаўствам афармляюцца дакументы на высылку іншаземца за межы Беларусі. Пры гэтым ён абавязаны пакінуць краіну на працягу месяца. Тэрмін забароны на ўезд у Беларусь (а ён можа доўжыцца ад 1 да 10 гадоў) вызначаецца начальнікам раённага праўлення. Акрамя таго, асоба, якая ўчыніла адміністрацыйнае парушэнне, будзе прыцягнута да адказнасці — у дадзеным выпадку па артыкуле 18.16 ч.1 КаАП Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае максімальнае пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на тэрмін да 15 сутак.

**Надзея ДРЫЛА.**

Добрыя справы

# «МІЖНАРОДНЫЯ АНЁЛЫ» ДАПАМАГЛІ БЕЛАРУСІ

«Angels International» — гэта ўплывовая брытанская дабрачынная арганізацыя. Яна ажыццявіла ў Беларусі праект дапамогі дзіцячым медыцынскім установам.

— «Анёлы» прыехалі ў нашу краіну 12 гадоў таму, і ўсе памятаюць, які гэта быў цяжкі час для краіны і для беларускай медыцыны, — узгадвае загадчык дзіцячага інфекцыйнага аддзялення Магілёўскай бальніцы № 1 Мікалай Буракоўскі. — Тады нам не хапала самых элементарных рэчаў, неабходных для лячэння дзяцей. Дабрачынная дапамога з Англіі была проста падарункам нябёсаў.

Арганізацыя паставіла ў Беларусь новае сучаснае медыцынскае абсталяванне коштам болей за мільён долараў: апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, кардыеманіторы, наркозныя апараты, апараты для ўльтрагукавых даследаванняў, дзіцячы рэанімацыйны аўтамабіль і інш.



Гэты здымак зрабілі англічане ў аперацыйнай апёкавага аддзялення Магілёўскай гарадской бальніцы № 1.

Увогуле, дабрачыннікі дапамаглі пяці бальніцам у Мінску, Магілёве, Бабруйску і Брэсце. Асаблівая ўвага была нададзена апёкаваму аддзяленню Магілёўскай бальніцы № 1: англічане набывалі дарагія мазі для лячэння апёкаў, унікальныя хірургічныя інструменты для аперацыяў, ложкі і розныя прыстасаванні для пацыентаў з цяжкімі апёкамі.

У Магілёў прыязджалі англійскія прафесары медыцыны, а больш за 20 нашых урачоў і медсёстраў прайшлі навучанне ў бальніцах Вялікабрытаніі.

Аднак праект завершаны: Беларусь цяпер стала іншай, яе сфера аховы здароўя развіваецца, і, вядома, ёсць у свеце іншыя краіны, якія маюць вялікую патрэбу ў дапамозе. Таму «Міжнародныя анёлы» цяпер накіроўваюцца ў Афрыку. Беларусы жадаюць «Анёлам» удачы ў новым праекце.

Англійскія дабрачынніцы Сара Бардэл, Джулія Кусінс і Карэн Робертс прыязджалі ў Беларусь больш за два дзесяткі разоў. Яны знаёміліся з краінай і цікаваліся яе культурай. Таму невыпадкова, што фінал вялікага дабрачыннага праекта і развітанне з Беларуссю адбыліся на канцэрце Магілёўскага аркестра народных інструментаў пад кіраўніцтвам Леаніда Іванова.

— Зямля — гэта малы шарык, дзе межы ўмоўныя, а палітычныя праблемы часовыя, і толькі добрыя ўчынкі і музыка застаюцца з намі назаўсёды, — падвёў вынік магілёўскі ўрач Мікалай Буракоўскі, які стаў ганаровым патронам «Міжнародных анёлаў».

**Ілона ІВАНОВА.**

Інфарм-укол

## Магній: № 1 для жанчын

**Спецыялісты сцвярджаюць, што магній больш за іншыя мінералы ўплывае на здароўе жанчыны.**

Колькасць магнію ўплывае на цяжарнасць. Магній называюць «супрацьстрэсавым элементам», паколькі ён неабходны для перадачы нервовых імпульсаў. Гэты мінерал падаўляе дэпрэсію і падтрымлівае ў здаровым стане сістэму кровазвароту. Зніжэнне колькасці магнію ў арганізме можа прывесці да з'яўлення сімптомаў так званага перадменструальнага сіндрому — зябкасці, раздражняльнасці, стомленасці, змены вагі. Асабліва небяспечны недахоп магнію пры цяжарнасці, паколькі гэта можа прывесці да нараджэння дзяцей з нізкай вагой або неданошаных. Неабходны магній і тым жанчынам, якія прымаюць камбінаваныя аральныя кантрацэптывы і замяшчальную гарманальную тэрапію. Эстрагены, якія ўтрымліваюцца ў іх, спрыяюць вывядзенню магнію з арганізма. Магній адказвае за энергетычны, бялковы, вугляводны і тлушчавы абмен, забяспечвае трываласць касцей, спрые засваенню кальцыю. Магній і кальцый узаемадзейнічаюць у арганізме, яны павінны абавязкова знаходзіцца ў раўнавазе.

Некаторыя рэчывы здольныя проста выводзіць магній з арганізма, напрыклад, многія кансерванты, якія выкарыстоўваюцца для прыгатавання прадуктаў харчавання і напояў, а таксама нікацін і алкаголь. Сімптомы недахопу магнію: схільнасць да дэпрэсіі, раздражняльнасць, перапады настрою, начныя сутаргі ікраножных мышцаў, цікі, адчуванне «камяка ў горле», павышаная стамляльнасць, дрэнны сон, галаўны боль, схільнасць да гіпертаніі, арытмія, нізкая ўстойлівасць да вірусных і бактэрыяльных захворванняў. Для папаўнення запасаў магнію з дапамогай прадуктаў харчавання неабходна рэгулярна ўжываць арэхі (міндаль, кеш'ю, арахіс), пякарскія дрожджы, хлеб з мукі грубага памолу, разынкі, бананы.

## Спецпрактыкаванні для мужчынскай «сілы»

**Існуюць досыць простыя і эфектыўныя методыкі, якія дазваляюць аднавіць палавую функцыю ў мужчын.**

Спецыялісты прапануюць звярнуць увагу на раўнамерную фізічную нагрузку — павольны бег, хуткая хада, плаванне, хада на адпаведных трэнажорах. Аэробныя нагрузкі наогул больш эфектыўныя за такія прэпараты, як «Віягра», паколькі адначасова трэніруюць сардэчна-сасудзістую сістэму і павышаюць узровень тэстастэрону. Наступныя практыкаванні непасрэдна павышаюць утрыманне тэстастэрону, які ўплывае на палавыя функцыі.

1. Лежачы на спіне, выцягніце рукі ўздоўж тулава. Удых, на выдыху ўзніміце ногі і закіньце іх за галаву так, каб дакрануцца пальцамі ног да падлогі за галавой. Заплюшчыце вочы і зрабіце 4—6 удыхаў і выдыхаў. На выдыху павольна апусціце ногі. Паўтарыце 2—6 разоў.

2. Лежачы на жываце, сагніце рукі як пры адцісканні. Далонямі ўпрыцеся ў падлогу на ўзроўні падпах, локці ўверх, ногі прамыя, наскі выцягнутыя. На ўдыху павольна ўзніміце галаву і плечы, абапіраючыся на рукі. Спіну прагніце так, каб тулава прыціснулася да падлогі. Затрымайце дыханне на некалькі секунд. Падчас выдыху апусціце плечы і галаву. Паўтарыце практыкаванне 6—8 разоў.

3. Лежачы на жываце, сагніце ногі ў каленях. Падчас удыху прыўзніміце ногі ўверх, вазьміцеся рукамі за ладыжкі. Прагніцеся. Апусціце ногі. Паўтарыце 4—12 разоў.

4. Устаньце. Пастаўце ногі на шырыні паўкроку. Удыхніце і на выдыху крыху нахіліце тулава ўніз, далоні пакладзіце на бёдры і затрымайце дыханне як мага даўжэй, уцягніце жывот. Калені крыху сагнутыя, плечы прыўзнятыя. Паўтарыце 3—10 разоў.

Проціпаказаннем да гэтых практыкаванняў з'яўляюцца недастатковасць кровазвароту 1— 2 ступені, язва страўніка і 12-перснай кішкі.

5. Практыкаванне Кегеля. Сцісніце мышцы таза на 3 секунды і расслабце. Выконвайце гэта практыкаванне двойчы ў дзень, спачатку па 10—15 разоў, і паступова — да 60—70.

Гэтыя практыкаванні ўзмацняюць кровазварот органаў таза, што спрыяльна адбіваецца на мочапалавой сістэме. Таксама карысны кантрасны душ, не менш як 7 змен халоднай і гарачай вады па хвілін кожная. Пачынаць і заканчваць трэба халоднай вадой.

Рэгулярна ўжывайце наступныя прадукты:

— грэцкі арэх, пятрушку, сельдэрэй, буракі, якія ўзмацняюць лібіда, павялічваюць колькасць і якасць спермы;

— цыбулю, якая спрыяе павелічэнню сэксуальнай трываласці ў мужчын;

— морапрадукты, яйкі — паляпшаюць лібіда;

— прадукты з высокім утрыманнем вітаміну С — павялічваюць колькасць спермы.

Неабходна абмежаваць:

— прадукты з вялікім утрыманнем вугляводаў, паколькі яны пагражаюць не толькі атлусценнем, але і прыводзяць да гарманальных парушэнняў, зніжэння ўзроўню тэстастэрону;

— тлустае мяса, лішак якога прыводзіць да зніжэння палавых функцый;

— высокакаларыйныя прадукты.

Не варта без асаблівай неабходнасці ўжываць анабалічныя стэроіды, гарманальныя і снатворныя прэпараты.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА..**

# Круглянская ПМК-266: ПРАЦАГОЛІКІ І МАКСІМАЛІСТЫ БУДУЮЦЬ ШКЛОЎСКУЮ АЛЕКСАНДРЫЮ

## Круглянскія будаўнікі ўзводзяць шмат важных аб'ектаў у гарадах і сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці

### Сумленныя будаўнікі

Раніца працоўнага дня. У прыёмнай начальніка будаўнічага прадпрыемства «Круглянская ПМК-266» ёсць наведвальнікі, але няма сакратара. Як высветлілася, большасць офісных работнікаў адправілася ў Шклоўскі раён. Тры дні ў вёсцы Старасельле 27 чалавек з канторы клеюць шпалеры. Здаць строга ў тэрмін дзесятак новых домікаў на тэрыторыі ААТ «Александрыйскае» — справа гонару для ўсёй арганізацыі.

— У нас тут калектыў аднадумцаў! — падкрэслівае начальнік Круглянскай ПМК-266 Мікалай ПАТРОНЧЫК. — Нашы служачыя ўсё добра разумеюць: калі трэба падставіць плячо — паехалі і зрабілі.

Самы галоўны аб'ект і гордасць круглянскіх будаўнікоў — аграгарадок Александрыя.

— Гэта вялікая адказнасць, усё ж такі радзіма Прэзідэнта краіны, — гаворыць Мікалай Васільевіч. — Мы там будуем тры гады паводле даручэння Магілёўскага аблвыканкама. Інвестарам выступіў Нацыянальны банк. Давялося капітальна працаваць, закасаўшы рукавы. Там ёсць усе накірункі сучаснага будаўніцтва: культура, сельская гаспадарка, адукацыя, ахова здароўя, жыллё, добраўпарадкаванне тэрыторыі. У ААТ «Александрыйскае» нездарма ездзяць па вопыт: паглядзець, як можа і павінна быць!

### Падымацца рана, класціся позна

Сёлета спаўнілася 13 гадоў, як ПМК-266 узначаліў Мікалай Патрончык. Толькі адна красамоўная лічба: за гэты час у арганізацыі працавалі толькі 148 чалавек, а цяпер — на тысячу болей.

Кіраўніка зусім не бянтэжыць, што круглянскія будаўнікі называюць яго Патронам: гэта вытворнае ад прозвішча слова адлюстроўвае аўтарытэт начальніка. Мікалай Васільевіч заслужыў павагу сваіх падначаленых патрабавальнасцю, справядлівым стаўленнем да людзей і клопатам аб іх.

Працоўны дзень начальніка ПМК пачынаецца а 6-й раніцы. Першая планёрка адразу адбываецца прама на вуліцы. Будаўнікі бяруцца за працу строга а 8-й гадзіне, і без спазнення ў аўтобусы з рабочымі павінны прыбыць на аб'екты, якія месцамі часам за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад Круглага. Завяршае працу Мікалай Патрончык позна ўвечары: трэба сустрэць брыгады, падвесці вынікі, вырашыць неадкладныя пытанні.

Улетку круглянскія будаўнікі працуюць да 19 гадзін: гэта ж самая гарачая пара! І субота таксама аб'яўлена працоўным днём. У ПМК працуюць шмат і інтэнсіўна, але агульная колькасць працоўных гадзін за год не перавышае — то за іх плацяць удвая болей, са згоды працоўнага калектыву.

— У нас сярэдні заробак — 1 мільён рублёў, што даволі значна для гарадскога пасёлка Круглае, — ганарыцца Мікалай Васільевіч. — Мы аддаём заробак максімальна — гэта вартае ўзнагароджанне за добрую працу. Я, шчыра кажучы, вельмі задаволены, калі людзі шмат зарабляюць. Паглядзіце на стаянку для аўтамабіляў работнікаў — там вольных месцаў зусім небагата. Гэта паказчык дабрабыту будаўнікоў.

### Ад рэпутацыі да заробкаў і падаткаў

Сёння Круглянская ПМК — самы буйны падаткаплацельшчык у раённы бюджэт і самая буйная арганізацыя з падобных у Магілёўскай вобласці. Толькі летась ПМК-266 заплаціла ў бюджэт 11 мільярдаў рублёў. Яна выконвае вялікія аб'ёмы працы: сёлета плануецца асвоіць 65—70 мільярдаў рублёў.



Мікалай ПАТРОНЧЫК упэўнены, што ў будаўнікоў заўсёды будзе праца — у любы час і пры любым ладзе жыцця.

Хаця былі ў гісторыі гэтай арганізацыі і іншыя часіны. У 1990-я гады, у пераходны перыяд, працы будаўнікам хранічна не хапала. Круглянская ПМК-266 тады настойліва шукала аб'екты ўсюды. Прасілі, пагаджаліся будаваць у доўг, бралі крэдыты на выплату заробкаў. Але працавалі і калектыў захавалі.

— Раней мы за працай ганяліся, а цяпер — яна за намі, — не хавае задавальнення Мікалай Патрончык. — Мы здолелі за мінулыя гады стварыць сабе рэпутацыю сур'ёзнай арганізацыі, якая адказвае за якасць, колькасць і тэрміны будаўніцтва. Праўда ў тым, што заказчык заўсёды шукае арганізацыю падрадчыка, які добра сябе зарэкамендаваў на будаўнічым рынку.

Круглянская ПМК-266 сёння развіваецца імклівымі тэмпамі. Паводле вынікаў працы яна ўжо была першай на Магілёўшчыне, а потым — другой у рэспубліцы, калі круглянцаў абышла толькі сталічная будаўнічая арганізацыя.

Сёння ПМК выконвае ўсе віды работ. Круглянскія будаўнікі ўсё робяць самі: ад капкі траншэй і катлаванаў да водаправода, каналізацыі, электрычнасці, сантэхнікі і, нарэшце, аздаблення. Тут працуе свой растворна-бетонны вузел: сёлета ўлетку ў дзень ПМК-266 расходавала на дзень два вагоны цэменту.

— Мы, круглянскія будаўнікі, паводле сваёй натуры працаголікі і максімалісты, — расказвае Мікалай Васільевіч. — У нас сёння 150 адзінак тэхнікі — цэлы парк. Ёсць свае падсобныя вытворчасці: сталярка, некалькі піларам. У швачным цэху робяць спецадзенне. Ёсць нават свая цырульня: зробяць вам любую прычоску за ўмераную плату. Трэба яшчэ не забыцца пра пасеку і сажалку з рыбай! Цяпер гарачая ўборачная пара: сваім работнікам за сімвалічныя грошы ўбяром збожжа і выкапаем бульбу. Калі трэба — дадзім пазыку: штомесяц крэдытуем на 80—100 мільёнаў рублёў. Усё для людзей!

### Хто працуе — таму і шанцуе

Мікалая Васільевіча часта пытаюцца: «У чым сакрэт поспеху? Як удалося невялікай ПМК з гарадскога пасёлка стаць магутнай будаўнічай арганізацыяй, якая ўзводзіць важныя аб'екты вобласці?»

— Не, гэта не проста пашанцавала, — задумаўся кіраўнік. — Адчыняюцца дзверы тым, хто ў іх грукае. А, па-другое, хто працуе — таму і шанцуе. Я пра гэта ведаю з дзяцінства...

Мікалай Патрончык родам з маленькай вёскі на Круглянішчыне. Яго бацькі — вясковыя інтэлігенты. У сям'і было чацвёра дзяцей, і ім таксама даводзілася шмат працаваць.

— А праца, як вядома, паляпшае чалавека, — усміхаецца кіраўнік. — Бацькі далі нам веды і адукацыю, прывучылі да працы і дысцыпліны. І я ведаю, што добры будаўнік — той, які робіць ад пачатку да завяршэння абдумана, узважана, адказна.

Паўтара месяца ў будаўнічых атрадах на аб'ектах ПМК адпрацавалі старшакласнікі з Круглянскага і Шклоўскага раёнаў. Зарабілі падлеткі няблага: у месяц атрымалася 500—600 тысяч рублёў. За свае заробкі задаволеныя дзеці набылі цяпер мабільныя тэлефоны, веласіпеды і камп'ютары.

— Такія будаўнічыя атрады дысцыплінуюць і выхоўваюць дзяцей, якія хочуць адразу і шмат чаго, — робіць выснову Мікалай Патрончык. — Яны на сабе паспытаюць, ці цяжка зарабіць капейку. Што ж, будаўнічы занятак — сапраўды не з лёгкіх. Умовы цяжкія: пад адкрытым небам даводзіцца працаваць у любую непагадзь, на будаўнічай пляцоўцы брудна — гэта вам не чысценькі офіс з кандыцыянерам.

— Аднак хоць гэта і няўдзячная праца, але высакародная, — гаворыць аб прафесіі будаўніка Мікалай Васільевіч. — Таму што мы будуем помнікі часу. Мае дзеці ідуць па вуліцах і пытаюцца: «Ты гэта будаваў, бацька?» Так, пры маім удзеле. І школа, і бальніца, і жылыя дамы... Нашы будынкі добра выглядаюць, яны даўгавечныя і служаць чалавеку.

**Мікалай Патрончык, начальнік будаўнічага прадпрыемства «Круглянская ПМК-266":**



**«Я віншую ўсіх з Днём будаўніка! Жадаю далейшых поспехаў у працы, сямейнага шчасця, дабрабыту, здароўя, вялікіх заробкаў. Каб у калектывы будаўнікоў улiваліся высокакваліфікаваныя спецыялісты. Каб у нас было болей заказаў і працы. Каб мы ўсе былі запатрабаваныя ў будучым. Са святам!»**

### Еўропа ў беларускай глыбінцы

Цяпер у гарадскім пасёлку Круглае ёсць абсалютна еўрапейскае па стылі месца, якое робіць надзвычай прыемнае ўражанне. Гэта гандлёвы цэнтр «Гаспадар», які належыць Круглянскай ПМК-266. Тут прадаецца ўсё: любы капрыз — ад запалак да будаўнічых матэрыялаў. Але рэч яшчэ і ў тым, што тэрыторыя навокал гандлёвага цэнтра выдатна добраўпарадкаваная: адзіны ў раённым цэнтры фантан, лавы, адкрытае кафэ. Круглянскія маці кажуць, што вельмі любяць тут адпачываць са сваімі малымі.

ПМК зрабіла капітальны рамонт школы №1 — яе цяпер нездарма называюць «цукеркай». А побач са школай месціўся былы будынак Дома піянераў — стары, драўляны. На яго месцы і з'явіўся сучасны гандлёвы цэнтр, які стаў сапраўдным упрыгажэннем раённага цэнтра.

Увогуле, усе будоўлі роднага Круглянскага раёна — толькі сіламі ПМК-266. Напрыклад, капітальнаму рамонту раённай бальніцы, які нядаўна зрабілі мясцовыя будаўнікі, зайздросцяць і медыцынскія ўстановы абласнога цэнтра. Там ёсць на што паглядзець: як з прыстасаванага інтэрнатаўскага будынка атрымалася сучасная паліклініка, а па адноўленым тэрапеўтычным корпусе можна вадзіць экскурсіі.

Дарэчы, круглянцы цяпер рамантуюць сельскую амбулаторыю ў суседнім Талачынскім раёне. Хоць гэта і іншая вобласць, але людзі з гэтага раёна прыйшлі на працу ў ПМК-266, і цяпер забраць паўсотні працаўнікоў штодня ездзіць спецыяльны аўтобус.

### Жорстка, але справядліва

— Вядома, людзі імкнуцца ў нас працаваць, — пацвярджае Мікалай Патрончык. — Праўда, у нас жорсткі рэгламент. Як мне шчыра сказаў адзін брыгадзір, калі я стаў начальнікам: жорстка, але справядліва. Такі мой метад працы. А па-іншаму тут і нельга. Будаўнічы комплекс — гэта жывы канвеер, гэта людзі. Даводзіцца дысцыпліну трымаць. Цяпер будаўнікі запатрабаваныя, таму на працу прымаем ледзь не ўсіх і прасейваем іх праз сіта нашай працы і парадку. Здольныя працаваць — застаюцца. Толькі за працу без прагулаў мы плацім штомесячную прэмію ў 70 тысяч рублёў. Так што нездарма людзі вырашылі, што ў Патрона можна працаваць і зарабляць.





Сучасны гандлёвы цэнтр у еўрапейскім стылі круглянскія будаўнікі ўзвялі на месцы старога драўлянага будынка Дома піянераў.

Сам Мікалай Васільевіч — зусім не кабінетны кіраўнік. Ён пастаянна на аб'ектах, у цесным кантакце з людзьмі, прычым кожнага працаўніка ведае і памятае імя па бацьку. Начальнік будаўнікоў, я даецца, у захапленні ад дамовіі.

— Удалы кіраўнік — калі ёсць узаемаразуменне з людзьмі, — зазначае Патрончык. — Усё трымаецца на даверы і павазе. У нас рабочыя кажуць: начальнік шмат працуе, і мы разам з ім.

Калі шчыра, то ён ужо мог бы пайсці на заслужаны адпачынак. Пакуль не па ўзросце, а па стажы. Мікалай Васільевіч прайшоў усе прыступкі кар'еры будаўніка, якую ўвянчала нядаўна прысвоенае званне «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь». І нягледзячы на ўсе дасягненні, Мікалай Васільевіч імкнецца далей і баіцца, паводле яго слоў, «змарнець без працы».

— Буду працаваць, пакуль буду патрэбны сваёй арганізацыі і дзяржаве, — запэўнівае ён.

### Перспектывы — добрыя

Заўтра работнікі Круглянскай ПМК-266 адзначаць сваё прафесійнае свята — Дзень будаўніка. Працоўную суботу аб'явілі святочным днём, арганізавана ўрачыстасць з канцэртам.

Мікалай Патрончык упэўнены ў тым, што будаўнікі заўсёды будуць патрэбны. У любы час і пры любым ладзе жыцця.

— Да 2010-га будзем рабіць аграгарадкі, потым выконваць праграму па будаўніцтве, якая ўжо распрацавана яшчэ на 10 гадоў, — будуе доўгатэрміновыя планы начальнік ПМК. — Людзям, гараджанам і вяскоўцам, патрэбуецца новае жыллё. Мы будзем будаваць жылыя дамы ў Магілёве, Круглым і Шклове. У нашым райцэнтры будзе ўзводзіцца цагляны завод. Адбываецца акцыянаванне сельскіх гаспадарак і перапрацоўчых, а гэта значыць, што прыйдуць інвестары, будуць будаваць, рабіць рэканструкцыі, ствараць новыя прыбытковыя вытворчасці. Так што ў нас будзе праца. А гэта самае галоўнае!

Матэрыял падрыхтавалі Ілона ІВАНОВА і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.

УНП 700107378



Офісны будынак круглянскіх будаўнікоў упрыгожвае раённы цэнтр.



Круглянцы рыхтуюцца засяліцца ў новы жылы дом: рабочыя ПМК-266 заканчваюць добраўпарадкаванне тэрыторыі.

---

## Літоўскія тэлефонныя аферысты прымушаюць дзяцей выносіць маёмасць і грошы з дома

**Тэлефонныя махляры ў літоўскім горадзе Клайпеда падманам прымусілі шасцігадовае дзіця вынесці з дома і аддаць ім грошы, камп'ютар, каштоўнасці і іншую маёмасць на агульную суму 30 тыс. літаў (8700 еўра), паведамляе агенцтва тэленавін LNK.**

Злачынцы патэлефанавалі маленькай дзяўчынцы дадому і паведамілі аб выдуманым няшчасці з яе маці, якая ў той момант адсутнічала. Аферысты пераканалі дзіця, што толькі вялікая сума грошай можа выручыць маці з бяды. Тэлефоннае махлярства ў Літве за апошнія пяць гадоў набыло маштабы стыхійнага бедства: толькі на мінулым тыдні падобным чынам злачынцы выманілі 39 тыс. літаў (11 304 еўра) у 13-гадовай жыхаркі Кедайняй. Некалькі дзён таму праваахоўныя органы Эстоніі затрымалі 11 літоўцаў, якія, прадстаўляючыся супрацоўнікамі паліцыі, падобным чынам вымагалі грошы ў жыхароў Эстоніі. Літоўскія тэлефонныя махляры распаўсюдзілі сваю злачынную дзейнасць не толькі на Эстонію, але і на Латвію і Скандынаўскія краіны.

**Алена ЮРКЯВІЧЭНЕ, БЕЛТА.**

## 14 ЛІТРАЎ ПАРФУМУ

Беспрацоўны жыхар Мінскага раёна аўтобусам незаконна ўвёз у нашу краіну з Расіі парфумерную прадукцыю на суму больш за 30,3 мільёна беларускіх рублёў. Калі лічыць у літрах, будзе каля 14.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## З-ПАД СТРАХІ ЛЯЦЕЛА ЗБРОЯ

На Палессі спрадвеку жылі людзі запаслівыя. Некаторыя лічылі нялішнім мець у гаспадарцы зброю, якую часта захоўвалі з часоў вайны. Вось адзін такі гаспадар з вёскі Гічыцы Івацэвіцкага раёна даўно адышоў на вечны спачын, а баявы арсенал па-ранейшаму захоўваўся на паддашку. Ды дом напаткала бяда — здарыўся пажар. Патроны пад уздзеяннем агню пачалі выстрэльваць, а потым з-пад страхі вываліліся аўтамат Калашнікава і вінтоўка. Выратавальнікі пажар ліквідавалі, але хата пенсіянеркі значна пацярпела.

**Яна СВЕТАВА.**

**Утерянные** представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха **бланки страховых полисов** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу, **серия БЛ № 571521, № 571529, считать недействительными**.

Спажывец

## ФЛІКЕР ФЛІКЕРУ НЕ ТАВАРЫШ

**У тым, што не ўсе флікеры аднолькава адбіваюць святло, я пераканалася на ўласныя вочы, калі пры дапамозе спецыяльнага ліхтара — мініяцюры фары аўтамабіля — паглядзела на рознакаляровыя элементы пасіўнай бяспекі з невялікай адлегласці. Атрымліваецца, што нават той свядомы чалавек, які набыў флікер, і спакойна ідзе па краі праезнай часткі цвёрда перакананы, што бачны для вадзіцеля, можа знаходзіцца ў небяспецы.**



Флікеры БЫВАЮЦЬ розныя (аранжавыя, сінія, чырвоныя...), але ПАВІННЫ БЫЦЬ выключна бела-шэрага альбо ярка-лімоннага колеру.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Бірулька замест флікера?

— Яшчэ чатыры—пяць гадоў таму ў нашай краіне не ўсе ведалі, што такое флікер, — расказвае дырэктар ААТ «Белпрамэнергія» Аляксандр Колас. — І калі раней на рынках і ў пераходах бабулі прапаноўвалі цыгарэты, то зараз часта можна пачуць: «Флікеры, флікеры». У сувязі з тым, што рэалізацыяй гэтай прадукцыі сёння хто толькі не займаецца, і ўзнікаюць праблемы з якасцю: у прыватнасці, непакояць незадавальняльныя характарыстыкі па святлоадбіцці. Многія вырабы, асабліва дзіцячага накірунку, выкананы ў выглядзе сімпатычных звяркоў, смайлікаў, машынак. І нават няўзброеным вокам бачна, што ўсе гэтыя рознакаляровыя вырабы могуць быць чым заўгодна, але толькі не святлоадбівальнікамі, якія прызначаны абараняць пешахода ноччу.

Прыкладам можа служыць даследаванне, якое правялі супрацоўнікі «Белпрамэнергіі». Высветлілася, што святлоадбівальнік у выглядзе коціка зялёнага колеру бачны ў бліжнім святле фараў легкавога аўтамабіля ўсяго з 80 метраў. Гэтай адлегласці, безумоўна, недастаткова, каб адрэагаваць вадзіцелю (за горадам пры хуткасці 90 км/г гэту адлегласць вадзіцель пераадольвае за 3 секунды).

— На рынку зараз вельмі шмат прадпрыемстваў, якія пастаўляюць элементы, якія не маюць ніякіх адносінаў да бяспекі дарожнага руху. Я сам нядаўна ехаў вечарам па горадзе, — працягвае Аляксандр Міхайлавіч, — а насустрач — маці з сынам, на куртачцы якога вісіць нешта падобнае на бірульку і ледзь свеціцца. Вось бачыце, маці думае, што сын знаходзіцца ў бяспецы з так званым святлоадбівальным элементам. А насамрэч гэта абазначэнне ледзь бачна кіроўцу нават з блізкай адлегласці. Таму калі на вырабе напісана «святлоадбівальны элемент» ці «сродак пасіўнай бяспекі», то ён павінен быць прыкметным, у іншым выпадку вытворцы павінны пісаць на ўпакоўцы — «бірулька».

Святлоадбівальныя стужкі, якія выкарыстоўваюцца як ва ўніформе, так і ў звычайным адзенні, заплечніках, абутку, таксама бываюць розныя: якасныя і не вельмі. Яны адрозніваюцца каэфіцыентам святлоадбіцця (адлегласцю, з якой бачны флікер), колькасцю мыццяў, пасля якіх гэта палоска будзе бачна, ступенню выцірання, напрыклад, рамянём бяспекі ў аўтамабілі.

Спецыялісты праводзілі эксперымент: пырскалі пульверызатарам на розныя стужкі. У выніку некаторыя з іх пры асвятленні ліхтаром страчвалі здольнасць быць бачнымі ў цемры. Падобнае ўздзеянне на стужкі аказвае вільготнае надвор'е, дождж. Таму не толькі сам флікер, але і тыя матэрыялы, з якіх ён вырабляецца, павінны быць якаснымі.

**На што звяртаць увагу пры выбары флікера:**

— святлоадбівальнік павінен быць бела-шэрага альбо ярка-лімоннага колеру (толькі з матэрыялу гэтых колераў флікер будзе адпавядаць патрабаванням стандартаў);

— нанесеныя на святлоадбівальнік малюнкі закрываюць частку матэрыялу і зніжаюць эфектыўнасць элемента, таму чым меншы малюнак, тым лепш;

— плошча флікера павінна складаць не менш чым 15 квадратных сантыметраў на кожны бок;

— на ўпакоўцы вырабу павінна быць маркіроўка на адпаведнасць стандарту «СТБ ЕН 13356»;

— павінна быць інфармацыя аб вытворцы і імпарцёры прадукцыі;

— павінны быць пазначаны год выпуску, тэрмін дзеяння вырабу.

### Сертыфікацыя — фільтр «псеўдафлікераў»

1 верасня гэтага года плануецца ўвесці абавязковую сертыфікацыю здымных флікераў і святлоадбівальных матэрыялаў для іх вырабу (еўрапейскі сертыфікат распаўсюджваецца толькі на плёнкі белага і лімонна-жоўтага колераў). Новаўвядзенне будзе датычыцца таксама і вытворцаў адзення і абутку.

Спецыялісты прагназуюць, што ўвядзенне абавязковай сертыфікацыі дазволіць рознічнай сетцы больш выбарачна падыходзіць да тавару, які яны выстаўляюць на прылаўках, праваахоўным органам — арганізаваць адпаведны кантроль (такая праверка была праведзена ў 2004 годзе ў Эстоніі: дэпартамент па абароне правоў спажыўцоў выявіў у гандлёвай сетцы дзевяць святлоадбівальнікаў, якія не адпавядалі патрабаванням еўрапейскага стандарту. У выніку пастаўшчыкі і вытворцы былі падвергнуты строгім эканамічным санкцыям), а пакупнікам не сумнявацца ў тым, што яны набылі: звычайную бірульку ці элемент бяспекі.

**У Расіі і Польшчы, напрыклад, нашэнне элемента пасіўнай бяспекі мае рэкамендацыйны характар, у нас жа, згодна п. 17.1 ПДР — за адсутнасць флікера на адзенні начнога пешахода-невідзімкі пры руху па краі праезнай часткі прымяняецца адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе папярэджання ці штрафу ў памеры да 0,5 базавых велічынь, а ў выпадку знаходжання такога чалавека ў стане алкагольнага ап'янення — на суму ад 1 да 3 базавых велічынь. Калі ж парушэнне правілаў выклікала стварэнне аварыйных абставінаў, то пешаход, які не абазначыў сябе на дарозе, можа палегчыць свой кашалёк ад 0,6 да 3 базавых велічынь.**

**Надзея ДРЫЛА.**

## СЯКЕРА

Свет і сусвет чалавека

**Прылада працы, з дапамогай якой можна секчы, раз'ядноўваць рэчы, нарыхтоўваць дровы і г.д. Так, сякера ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян стала сімвалам «раз'яднання». Часам яна выступала прыладай забойства (напрыклад, галаву курыцы адсякалі менавіта сякерай). Сякера магла выступаць і сімвалам кроўнай ахвяры і помсты.**

- Часам сякера была сімвалам сілавога вырашэння пытанняў. І сёння існуе выраз: «Сказаў, як сякерай адсек...», які азначае рэзкі ў адносінах да суразмоўцы тон і валявое рашэнне.
- З сякерай параўноўвалі таго, хто дрэнна плаваў: «Плыве, як сякера».
- Сякера была абавязковай прыладай працы цесляроў, якія дзякуючы свайму майстэрству пры дапамозе сякеры і практычна без цвікоў будавалі храмы, капліцы, калодзежы і г.д.
- Сякера, як рэч з вострым лязом, якое раз'ядноўвае іншыя рэчы адным рухам, выкарыстоўвалі ў рытуальнай і магічнай практыцы, каб «рассекчы» нябачныя ніці, якія «ахутваюць чалавека» і не даюць яму магчымасці жыць паўнавартасным жыццём. У дачыненні да хворага з дапамогай сякеры выконвалі рытуальныя дзеянні: ставілі на сякеру; умоўна «секлі» на яго галаве рытуальныя рэчы; клалі сякеру пад яго падушку ці ложак.
- Часам сякеру як рытуальную рэч, якая сімвалізуе разрыў, выкарыстоўвалі ў сямейнай абраднасці. Так, пупавіну хлопчыка трэба было абавязкова адсекчы сякерай ці разрэзаць на сякеры.
- Калі паміраў адзін з блізнятаў, трэба было на парозе хаты рассекчы на дзве часткі манету, і тую частку, якая трапіла за парог, кінуць у магілу, а другую, тую, што трапіла ў хату, захаваць у ёй. Гэта дзеянне выконвалі, каб засцерагчы ад немінучай смерці другога з пары блізнятаў.
- Жанчыне, асабліва цяжарнай, забаранялася без нагоды браць у рукі сякеру, каб не справакаваць нараджэнне дзіцяці з рассечанымі, г.зн. «заячымі» вуснамі.
- Той жанчыне, якая збіралася яшчэ нараджаць дзяцей, забаранялася секчы галаву курыцы — гэта павінен зрабіць мужчына.
- Сякеру забаранялася прыносіць у хату ў той момант, калі рыхтавалі рошчыну ці калі хлеб стаяў у печы. Лічылася, што ў такім выпадку хлеб «няўдалы будзе».
- Парушэнне гэтых забаронаў выклікала шэраг негатыўных наступстваў у хаце: біўся посуд, не магла ацяліцца карова і г.д.
- Сякера ў шэрагу іншых вострых рэчаў (нож, серп, іголка) была абярэгам хаты ад нячыстай сілы і чалавека «з дурнымі намерамі».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## 60 ПРАЦЭНТАЎ МІНЧАН ПРАЙШЛО ДЫСПАНСЭРЫЗАЦЫЮ

На ўрачэбным аглядзе пабывалі 879 172 мінчаніны, паведаміла карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» галоўны спецыяліст аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына Талкачова. На жаль, стан здароўя абследаваных пакідае жадаць лепшага. У амаль 40 працэнтаў гараджан медыкі знайшлі тыя ці іншыя захворванні. Абсалютна здаровымі ўрачы прызналі толькі 15,7 працэнта мінчан. Маніторынг стану здароўя праводзіцца для прафілактыкі і ранняй дыягностыкі розных захворванняў. Ва ўзроставай катэгорыі ад 18 да 29 гадоў прапануецца вымярэнне артэрыяльнага ціску, вагі, здача агульнага аналізу крыві, мачы, праходжанне флюараграфіі. Ва ўзросце ад 30 да 39 гадоў дадаткова вымяраецца ўзровень халестэрыну ў крыві, робіцца электракардыяграма. Тым, каму 40 гадоў і больш, рэкамендуецца больш глыбокае абследаванне. Акрамя згаданых працэдур — ацэнка рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў па табліцы SCORE, вымярэнне ўнутрывокавага ціску, даследаванне функцыі работы прастаты.

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА,**
*«Мінск—Навіны».*

## Немаўля выратавалі казытаннем

Казытаннем пятак удалося выратаваць сваю нованароджаную дачку 29-гадовай брытанцы Энджэле Янг. На працягу некалькіх тыдняў казытанне падтрымлівала жыццё ў целе неданошанай дзяўчынкі, якая з'явілася на свет праз 6 месяцаў і 1 тыдзень пасля зачацця, перадаюць інфармагенцтвы.

Пры нараджэнні маленькая Эма важыла ўсяго паўкілаграма. Некалькі разоў дзяўчынка пераставала дыхаць, аднак бацькі знайшлі спосаб прымусіць яе лёгкія працаваць зноў. Кожны раз, калі бацькі ці медсёстры лёгенька драпалі ступні малой, яе цела рэагавала на казытанне актыўным дыханнем. Падобная тэрапія падтрымлівала жыццё ў кволым арганізме на працягу 15 тыдняў і дала дзіўныя вынікі. Нядаўна Эма адзначыла свой першы дзень нараджэння. «Мая дачка жывая, і ўсё дзякуючы казытанню яе пятак», — кажа мама дзяўчынкі.

**Кар. БЕЛТА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.36 | 20.53 | 15.17 |
| Віцебск — | 5.21 | 20.48 | 15.27 |
| Магілёў — | 5.26 | 20.43 | 15.17 |
| Гомель — | 5.28 | 20.34 | 15.06 |
| Гродна — | 5.52 | 21.08 | 15.16 |
| Брэст — | 5.58 | 21.03 | 15.05 |

**Месяц**

*Маладзік.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

**Пр.** *Алены, Аверкія, Георгія, Івана, Карпа, Макара.*
**К.** *Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма, Медарда, Севярына.*





## 8 жніўня

Дзве даты

**1959 год** — пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пасёлак Новастаробінск, які ўзнік у сувязі з будаўніцтвам Старобінскага калійнага камбіната, пераўтвораны ў рабочы пасёлак Салігорск.



**1898 год** — нарадзіўся Васіль Іванавіч Лебедзеў-Кумач, славуты савецкі паэт, адзін са стваральнікаў савецкай масавай песні. Аўтар тэкстаў песень да кінафільмаў «Цырк», «Волга-Волга», песень «Свяшчэнная вайна», «Вясёлы вецер» і многіх іншых.

Цытата дня:

***«Спачатку Бог стварыў мужчыну, пасля ён стварыў жанчыну. Затым Богу стала шкада мужчыну, і ён даў яму тытунь».***

**Марк Твен (1835—1910), амерыканскі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**Мужык адкрыў магазін, у якім прадаюцца трубы, барабаны, дамавіны, стрэльбы і пісталеты.**

**Сусед яму кажа:**

**— Ідыёцкі ў цябе нейкі набор тавараў, Макарыч!**

**— Як сказаць! Пазаўчора я прадаў барабан, учора — стрэльбу, а сёння — дамавіну!..**



